Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СТУДЗЕНЬ 31 1934 г. СЕРАДА № 25 (4858)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

„Ліквідацыя паразітычных класаў прывяла да знікнення эксплаатацыі чалавека чалавекам. Праца рабочага і селяніна вызвалена ад эксплаатацыі. Даходы, якія выціскаліся эксплаататарамі з народнай працы, астаюцца цяпер у руках працоўных і скарыстоўваюцца часткай для расшырэння вытворчасці і прыцягнення ў вытворчасць новых атрадаў працоўных, часткай—для прамога павышэння даходаў рабочых і сялян“. **(СТАЛІН)**

Павысіць ідэйную ўзброенасць і класавую пільнасць

17 з'езд увойдзе ў гісторыю як з'езд найвялікшых перамог нашай партыі. На практыцы, па вопыце многіх дзесяткаў мільёнаў даказана правільнасць генеральнай лініі партыі, даказана геніяльная прозарлівасць ленінскага кіраўніцтва на чале з тав. **Сталіным.**

З каласальным уздымам праходзяць сходы на фабрыках і заводах, у калгасах і соўгасах, прысвечаныя з'езду партыі і дакладу тав. **Сталіна.** Энтузіязм, з якім найшырэйшыя масы адабраюць прамову правадыра партыі, сведчыць аб тым, што з'езд тысячамі ніцей звязан з мільёнамі працоўных нашай краіны.

На вопыце нашай краіны даказана магчымасць перамогі социялізма ў адной асобна ўзятай краіне, даказана, што мы зможам пабудаваць социялістычнае грамадства, што самую цяжкую частку гэтай задачы мы ўжо прарабілі.

«... Усе гэтыя поспехі і, перш за ўсё, перамога пяцігодкі канчаткова дэмаралізавалі і разбілі нашчэнт усе і ўсякія антыленінскія групоўкі.

Траба прызнаць, што партыя згуртавана цяпер у адзінае, як ніколі раней», — гаварыў тав. **Сталін** у сваім дакладзе на 17 з'ездзе.

Калі яшчэ дзесяць год назад Ленін з пэўнай трывогай ставіў пытанне аб магчымасці расколу нашай партыі, то цяпер адзінства партыі настолькі ўмацавалася, а ворагі яе настолькі разбіты, што самая магчымасць расколу адкінута. Гэта найвялікшая маналітнасць партыі з'яўляецца адбіткам тых працэсаў, якія адбыліся за гэтыя гады ў эканоміцы СССР, у суадносінах класавых сіл. З перамогай калгаснага ладу няма ўжо больш двух розных асноў, на якіх яшчэ нядаўна базіравалася совецкая ўлада. А іменна-ж у перавазе ў эканоміцы краіны дробнейшых сялянскіх гаспадарак бачыў Ленін магчымую пагрозу расколу [illegible]

Ці трэба дзівіцца таму, што людзі, якія яшчэ недаўна жорстка змагаліся з партыяй у сваім фракцыйным аслепленні, прыбягалі да самай нізкапробнай дэмагогіі, паклёпаў, двурушніцтва, сёння прыходзяць з павінай к партыі. Праўда, не ўсе яшчэ з іх, відаць, да канца разумеюць цяжар сваіх намылак і злачынстваў перад партыяй. Сёй-той, напрыклад, схілен іх тлумачыць тым, што яны, моў, «кніжныя людзі», не зразумелі супярэчнасцяй пераходнага перыяду і т. д. Гэтыя таварышы і сёння не разумеюць, што антыленінскія «адценні», якія прадстаўляліся імі, з'явіліся рупарам варожых класавых сіл.

Але калі контррэволюцыйны трацкізм, правы ўхіл, права-«лявацкі» блок, нацыянал-ухілісты і інш. рознавіднасці апартуністычнага зарая разгромлены, то ці азначае гэта, што ніякіх ухілістаў у партыі больш няма? Вядома, не азначае. Далейшае наступленне социялізма па ўсяму фронту, неабходнасць перамагання перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей патрабуе яшчэ большага павышэння ідэйнай узброенасці і класавай пільнасці кожнага члена кампартыі.

«... Ці можна сказаць, што мы перамаглі ўжо ўсе перажыткі капіталізма ў эканоміцы? Не, нельга гэтага сказаць. Тым больш нельга сказаць, што мы перамаглі перажыткі капіталізма ў свядомасці людзей. Нельга гэтага сказаць не толькі таму, што свядомасць людзей у яе развіцці адстае ад іх эканамічнага становішча, але і таму, што ўсё яшчэ існуе капіталістычнае акружэнне, якое стараецца ажыўляць і падтрымліваць перажыткі капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей у СССР і супроць якога мы, большавікі, павінны ўвесь час трымаць порах сухім» **(Сталін).**

Іменна гэтыя перажыткі капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей з'яўляюцца пажыўнай глебай для ажыўлення ў той ці іншай форме астаткаў ідэалогіі разбітых антыленінскіх груп у галах паасобных членаў партыі, дастатковая тэарытычная падтоўка большасці членаў п[illegible] слабая ідэалогічная работ[illegible] тычных органаў, перап[illegible] партыйных работнікаў [illegible] тычнай работай—усё [illegible] чыць недастатковае [illegible] каторых пытан[illegible] домую ідэйну[illegible] вах некаторы[illegible] У дакл[illegible] у партыі [illegible] ніцкай [illegible] ніцкай [illegible]

партыйцаў па ладу пытанняў ленінізма: пабудова бясклясавага грамадства і пытанне аб умацаванні дыктатуры пролетарыята, сельска-гаспадарчая комуна і сельска-гаспадарчая арцель, марксісцкае разуменне роўнасці, лозунгі—зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі, нацыянальнае пытанне. Па ўсіх гэтых пытаннях тав. Сталін даў вычарпальны тэарытычны аналіз, магутным пражэктарам марксісцка-ленінскай мыслі асвятліў яшчэ раз перспектывы нашага развіцця, ускрыў і паказаў, у якім новым аблачэнні шчагаляюць часамі астаткі ідэалогіі разбітых антыпартыйных груп.

Даклад тав. **Сталіна** зноў і зноў ставіць пытанне аб неабходнасці далейшага павышэння тэарытычнага ўзроўню, узмацнення ідэалагічнай работы ва ўсіх звенях партыі, сістэматычнага выкрывання ідэалогіі і астаткаў ідэалогіі варожых ленінізму плыняў.

Ідэйная блытаніна немінуча змыкаецца з скрыўленнямі палітычнай лініі партыі ў практычнай рабоце. Узяць хоць-бы такое пытанне, як адміранне дзяржавы. Няўжо некаторыя гора-тэарэтыкі, асноўваючыся на няправільным разуменні пытання аб адміранні дзяржавы, не прыходзілі да «лозунгаў» аб ліквідацыі сельсоветаў у раёнах суцэльнай калектывізацыі?

Гэтыя лозунгі адмірання сельсоветаў і наогул аслаблення дыктатуры пролетарыята прыводзілі ў захапленне меншавікоў. «К гонару комунізма трэба сказаць, што ў яго асяродзішчы знайшліся яшчэ чэсна думаючыя людзі»—такі ваздушны пацалунак пасылалі меншавікі з «Социялістычнага вестніка» аўтарам кулацкай ідэалогіі аб «адміранні» сельсоветаў.

«Лявацкія» тэорыі аб адміранні гандлю, аб пераходзе да непасрэднага прадукта абмену і прамога [illegible] ва - апартуністычнай практыкай «замарожвання» таваразвароту.

«Лявацкія» разважанні некаторых, з дазволу сказаць, тэарэтыкаў, сцвярджаўшых, што грошы ператвараюцца ўжо ў разліковыя знакі, што прыходзіць «смерць грашам»,—знаходзілі свой адбітак у апартуністычнай практыцы зрыву бюджэтнай дысцыпліны.

Тав. Сталін са знішчальнай трохіній выкрыў тых таварышоў, якія лічылі, што раз мы ідзем да бясклясавага грамадства, то значыць можна аслабіць класавую барацьбу, аслабіць дыктатуру пролетарыята і наогул пакончыць з дзяржавай, якая, моў, усё роўна павіш на адмерці ў бліжэйшы час...

«І яны,—гаварыў тав. Сталін,—прыходзілі ў цялячае захапленне ў чаканні таго, што хутка не будзе ніякіх класаў—значыць, не будзе класавай барацьбы, значыць, не будзе клопатаў і трывог, значыць, можна скласці зброю і пайсці на бакавую — спаць у чаканні прыходу бясклясавага грамадства».

Гэтыя апартуністычныя спадзяванні і настроі яўна блізкія праваапартуністычнай тэорыі аб «мірным урастанні» капіталістычных элементаў у социялізм.

Як-бы ні быў разгромлен класавы вораг, астаткі яго да апошняга свайго ўздыху не пакінуць спроб вярнуць свой «утрачаны рай», вярнуць магчымасць эксплаатаваць рабочых і сялян. Іх спадзяванні, іх шалёнае супраціўленне жывіцца капіталістычным акружэннем, тымі авантурыстычнымі фашысцкімі кіруючымі групамі і ваеннымі зграямі, якія памышляюць аб нападзе на СССР.

Вось, напрыклад, як адзін з прадстаўнікоў астаткаў контррэволюцыйнага нацыяналістычнага падполля на Украіне фармуляваў пасля ўжо разгрому буржуазных нацыяналістаў далейшую тактыку барацьбы:

«...Уся зіма і частка вясны 1934 года пойдзе на арганізацыю блока замежных дзяржаў супроць СССР з мэтай інтэрвенцыі. Летам выбухне вайна. Нам трэба быць гатовымі. Зараз арганізацыя аслаблена і разбіта. Таму нашай самай адказнай задачай зараз з'яўляецца захаваць да канца свае старыя кадры, якіх засталося ўжо вельмі мала. Неабходна тактыка зашыфроўкі часовага адступлення, большай канспірацыі збірання яшчэ неразбітых сіл».

Тав. Сталін з ленінскай глыбінёй аналіза паказаў, што перажыткі капіталізма ў свядомасці людзей у галіне нацыянальнага пытання асабліва моцны і жывучы. Адыход ад ленінскага інтэрнацыяналізма — такава крыніца абодвух ухілаў ад лініі партыі: к мясцоваму нацыяналізму і вяліка рускаму шавінізму.

Тав. Сталін даў класічную фармулёўку пытання аб галоўнай небяспецы ў сучасных умовах: «Галоўную небяспеку прадстаўляе той ухіл, супроць якога перасталі змагацца і якому далі такім чынам разрасціся да дзяржаўнай небяспекі».

Гэта ацэнка галоўнай небяспекі ў нацыянальным пытанні адпосіцца таксама і да правага і «левага» ўхілаў у галіне агульнай палітыкі. Асаблівасць дадзенага моманта заключаецца ў тым, што за апошні час «левыя» канчаткова скаціліся на пазіцыі правых і па сутнасці справы нічым ад іх [illegible] адрозніваюцца. Паследкі трацкізма і паследкі правага ўхіла знаходзяцца ўжо за апошняй гранню свайго контррэволюцыйнага падзення.

Класавы вораг, шкоднік у сваёй злачыннай барацьбе супроць социялізма робіць стаўку на тых комуністаў, якія зрываюць партыйную і дзяржаўную дысцыпліну, на галавацяпаў, шляп, на самазадаволеных, зазнаўшыхся бюракратаў, якія не ведаюць даручанай ім справы і губяць яе, на людзей, якіх можна адурачыць, уцерці ачкі і штурхнуць саміх на шлях «очковтирательства», замазвання недахопаў.

І трэба сказаць, што гэтыя меркаванні класавага ворага часамі апраўдваліся. Але партыя наша веліка і моцна сваім уменнем бязлітасна ўскрываць недахопы, уменнем накіроўваць агонь самакрытыкі на адстаючыя ўчасткі і на канкрэтных носьбітаў зла, канкрэтных людзей, якія зрываюць работу.

Узняцце ўсяго арганізацыйнага кіраўніцтва да ўзроўню палітычнага кіраўніцтва, у прыватнасці тыя мерапрыемствы, якія намечаны ў галіне ўзмацнення партыйна-совецкага кантроля, дапамогуць да канца вырашыць найвялікшыя задачы другой пяцігодкі, пяцігодкі пабудовы бясклясавага социялістычнага грамадства.

Павышаючы ідэйную ўзброенасць кожнага комуніста, павышаючы класавую пільнасць і жалезную дысцыпліну ў сваіх радах, партыя пад кіраўніцтвам ленінскага Цэнтральнага Камітэта і свайго любімага правадыра і настаўніка тав. **Сталіна,** пойдзе да новых вышынь социялізма, да новых баёў і перамог. **(«Правда»)**

XVII З'ЕЗД ВКП(б)

[illegible]ОРНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 29 СТУДЗЕНЯ

[illegible] пасяджэнні з'езда, [illegible] пад старшынствам [illegible] прадаўжаліся [illegible] 320 руб., [illegible] прадаўжаліся [illegible] р, атрымліва[illegible] здачнаму дакладу [illegible] камітэта ВКП(б). [illegible] старшчага сына [illegible] ілі т. т. Сар- [illegible] (Іванаўская [illegible] Даброва [illegible] ій путь», [illegible] Ма- [illegible] закончыўся [illegible] працоўкі [illegible] тав. [illegible] лада тав. Сталіна. [illegible] рамо [illegible] ніці [illegible] ці [illegible]

ЯСТРЭМСКІ.

задачах, якія стаяць перад ёй у другім пяцігодзі. З'езд праводзіў тав. Орджанікідзе бурнымі апладысментамі, пераходзячымі ў авацыю.

Тав. Мікаян, спатканы доўгімі апладысментамі, прысвяціў сваю прамову развіццю таваразвароту, пытанням культурнага совецкага гандлю і асабліва падрабязна спыніўся на арганізацыі снабжэння. Заключныя словы прамовы тав. Мікаяна былі пакрыты бурнымі апладысментамі.

Выступленнем т. Мікаяна закончылася вячэрняе пасяджэнне з'езда.

XVII З'ЕЗД ВКП(б)

ПАРТЫЙНАМУ З'ЕЗДУ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАМОГ

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі Германіі шле ад імя Комуністычнай партыі і рэволюцыйнага пролетарыята Германіі гарачае рэволюцыйнае баявое прывітанне ВКП(б), першай і лепшай арганізацыі большэвікоў і правадыру Комуністычнага Інтэрнацыянала, яе XVII партыйнаму з'езду — з'езду социялістычных перамог.

Дасягнутыя вамі рэзультаты ў галіне пераможнага социялістычнага будаўніцтва каласальны. Народы Совецкага Саюза, а разам з імі рэволюцыйны пролетарыят уся го свету могуць з гордасцю адзначаць гэтыя дасягненні.

Ніколі ў сусветнай гісторыі расколатым на класы народам і сістэме капіталістычнага спосабу вытворчасці не ўдавалася дасягнуць такіх гіганцкіх поспехаў у будаўніцтве прамысловасці і ў сельска-гаспадарчай вытворчасці, дасягнуць такога быстрага тэмпа і такой выключнай вышыні.

Усе буржуазныя тэорыі аб тым, што адзіна магчымай і паспяховай з'яўляецца капіталістычная эканоміка, канчаткова абвергнуты вялікімі поспехамі вашай социялістычнай планавай гаспадаркі, яе прагрэсіўнасцю і велізарнай перавагай. Гэта мае тым большае значэнне, што іменна зараз, з прычыны паглыблення агульнага крызіса капіталізма, з прычыны чрэватага рэволюцыяй і вайной становішча ў Еўропе, Азіі і ва ўсім свеце сотні мільёнаў людзей шукаюць у пролетарскай рэволюцыі выхаду з капіталістычнай анархіі, фашысцкага тэрора і неразрыўна звязаных з капіталізмам войн і пасляваенных спусташэнняў.

Справа вашай пераможнай Окцябрскай рэволюцыі пад кіраўніцтвам сталёвай большэвіцкай партыі, спачатку на чале з геніяльным незабыўным правадыром Леніным, а затым са шчыра адданым рабочаму класу т. Сталіным — лепшым вучнем Леніна — прывяла да раду гістарычных перамог у будаўніцтве социялізма, на шляху да комунізма, да бясклясавага грамадства.

Вашы дасягненні паказваюць рабочаму класу ўсяго свету, што социялізм на адной шостай частцы земнага шара — гэта не ўтопія, а сапраўднасць.

Яны паказваюць яму, што ёсць толькі адзін шлях да социялізма —шлях пераможнай пролетарскай рэволюцыі — дыктатуры пролетарыята — улады совецкаў.

Пераможнае ўзброенае паўстанне пролетарыята пракладае шлях і стварае фундамент для пабудовы социялізма.

Социялізм — гэта першая ступень комуністычнага грамадства. Социялізм азначае разбурэнне сістэмы бедных і багатых, эксплаатуемых і эксплаататараў. Гэтага вы, таварышы, дасягнулі. Гэтага мы хочам дабіцца ў Германіі. У вас няма фашызма, у вас — социялізм.

Вы пабудавалі тысячы прадпрыемстваў і адчынілі дзверы новых заводаў 20 млн. рабочых. У нас, у Германіі, мільёны беспрацоўных.

Вы стварылі сотні тысяч калгасаў у вёсцы і вядзеце вёску насустрач шчаслівому жыццю. У нас лютуе аграрны крызіс. Зямля нашых дробных сялян абцяжарана даўгамі ліхварам і памешчыкам. Наш дробны селянін разараецца юнкерамі і фашысцкай дыктатурай.

Вы падняслі агульную накупальную здольнасць шляхам павышэння зарплаты, скарачэння кватэрнай платы, павышэння дзяржаўнай рэнты для інвалідаў працы.

У нашай краіне самымі рознастайнымі метадамі рабочым, служачым і чыноўнікам скарачаюць зарплату і аклады.

Іх пазбавілі больш чым 12 млрд. марак дахода.

На велізарных прасторах Далёкага Ўсхода вы вызвалілі сялян на 10 год ад усякіх падаткаў і далі ім сотні тысяч галоў жывёлы, каб падняць іх добрабыт. У нас дробныя і сярэднія сяляне плацяць падаткі за юнкераў, і ім прыходзіц па для гэтага закладаць свой участак. А юнкеры атрымліваюць яшчэ і дзяржаўныя субсыдыі.

Праз професіянальныя саюзы вы дапамагаеце социялістычнаму будаўніцтву. Вы падняслі жыццёвы ўзровень мас, дабіліся найвышэйшых дасягненняў у галіне культуры і выхавання мас да калектыўнага дзеяння.

У нас фашызм разбурыў професаюзы, гвалтоўна ліквідаваў завоемы, развівае варварства і кінуў у турмы, на катаргу і ў канцэнтрацыйныя лагеры больш 150 тыс. рабочых, сялян, дробных гандляроў і інтэлігентаў.

Вы ў музеях паказваеце прылады катаванняў часоў царызма, паказваеце рабочым і сялянам ранейшыя крэпасці капіталістычнай дыктатуры.

У нашай краіне рабочых б'юць, збіваюць, катуюць, членаў партыі катуюць да смерці і забіваюць. Вось дзве сістэмы.

У вас социялізм — пастаянна растучы добрабыт і культура.

У нас капіталізм — фашысцкі тэрор і голад.

Вы — рабочыя, сяляне і рамеснікі — дабіліся сапраўднага адзінства народу, найшырэйшага адзінства народаў, бо вы звяржэннем капіталістаў стварылі прадпасылкі для класавага адзінства.

У нас фашысцкае «нацыянальнае адзінства» такое, што пануючыя в'ядзюць за адзін абед больш, чым рабочы атрымлівае ў тыдзень.

А для рабочага каніна, селядцы і сухая бульба сталі штодзённым «абедам у адну страву».

Скінуўшы эксплаататараў, вы стварылі сабе бацькаўшчыну і радзіму ва ўласнай краіне. Рабочыя і сяляне атрымалі ўсё, што варта абараняць. Гэта — ваша краіна, краіна рабочых і сялян. Гэту краіну вы, узброены народ, абараняеце супроць нападу імперыялістаў.

У гітлераўскай Германіі, у краіне падвойнага грабяжа — з боку ўласных і замежных вераольскіх капіталістаў — рабочым і працоўным абсалютна няма чаго абараняць. Яны могуць дабіцца свайго социяльнага і нацыянальнага вызвалення толькі шляхам перамогі над ворагам ва ўласнай краіне.

Калі германскі працоўны народ хоча прысці да социялізма і добра быту, калі ён хоча стварыць сабе сапраўдную радзіму, якую варта было-б абараняць, тады ён павінен непахісна пайсці па шляху социяльнай рэволюцыі.

Так званая «нацыянальная рэволюцыя» ў Германіі становіць сабою наймацнейшую дыктатуру рэакцыянераў: Тысенаў, Сіменсаў, Клекнераў. Пролетарская рэволюцыя пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі — гэта рэволюцыя, якая вядзе да социялізма.

У вас няма фашызма. У вас — социялізм, бо партыя большэвікоў перамагла социял-дэмакратычных меншавіцкіх раскольнікаў і ўсіх апартуністаў, сабрала пад сваім сцягам большасць рабочага класа, а большэвіцкая партыя стала адзі на масавай партыяй рускага пролетарыята.

У нас социял-дэмакратыя здолела яшчэ захаваць у сіле раскол рабочага класа і замест социялізма прывяла германскі пролетарыят да фашызма. Усе яе тэорыі і тэорыі яе дапаможніка контррэволюцыйнага прахвоста Троцкага жалкім чынам праваліліся. Справа совецкаў таржэствуе перамогу над тым, хто ганьбіць Маркса і з'яўляецца ворагам ленінізма. І зараз яшчэ социял-дэмакратыя прабуе прадаўжаць сваю раскольніцкую работу. Яна сабатуе штодзённую барацьбу, антыфашысцкі адзіны фронт рабочых. Яна выстаўляе мніма рэволюцыйныя лозунгі аб «дыктатуры пролетарыята і пераходнай стадыі да дэмакратыі» і свядома і паклёпніцка прыраўноўвае совецкую сістэму да варварскага рэжыма фашызма.

Яна выдае сябе за «трэцюю сілу», перашкаджаючую большэвізму, і імкнецца да аднаўлення збан крутаваўшай Веймарскай сістэмы ў новай форме.

Узброіўшыся прыкладам перамогі рускага рабочага класа, мы ўзмацнім нашы стараннi заваяваць social-дэмакратычных таварышоў па класу на заводах, у майстэрнях і ў канторах на бок большэвізма, разбіць галоўную социяльную апору буржуазіі ў лагеры рабочага класа.

Таварышы, дасягнутыя вамі рэзультаты ў будаўніцтве социялізма з'яўляюцца вынікам непрымірымай класавай барацьбы. Чым энергічней социялізм ідзе наперад, насустрач бясклясаваму грамадству, натхняючы пролетарыят усяго свету ў яго барацьбе; чым мацней Совецкі Саюз у якасці фактара міру перашкаджае імперыялістычным падпальшчыкам вайны, — з тым большай лютасцю імперыялісты імкнуцца пачаць імперыялістычны грабёж і класавую вайну супроць Совецкага Саюза.

Урад падпальшчыкаў — Герынга і Гітлера — стаў побач з японскім імперыялізмам галоўным фактарам вайны. Мы запэўніваем вас, што мы адчуваем сябе неразрыўна звязанымі з пролетарыятам Совецкага Саюза і яго пераможнай класавай Чырвонай арміяй у імкненні знішчыць сумесна з рабочымі ўсяго свету ўсякага капіталістычнага разбойніка, які нападае на Совецкі Саюз.

Наша партыя следуе вучэнню Леніна аб тым, што толькі большэвіцкая масавая барацьба да вайны за ператварэнне імперыялістычнай вайны ў грамадзянскую стварае гарантыю перамогі рэволюцыі ў сувязі з вайной. Вось чаму наша партыя паставіла перад сабой задачу разгарнуць найшырэйшае ідэйнае наступленне сярод рабочых, моладзі і салдат у фашысцкіх масавых арганізацыях на заразу шавінізма, узмацніць баявую арганізацыйную работу ў цэнтрах падрыхтоўкі вайны і перш за ўсё і ў тэрміновым парадку стварыць незалежныя класавыя профсаюзы.

Таварышы! У германскіх рабочых масах з дня ў дзень расце нянавісць да рэжыма фашысцкіх катаў і грабежнікаў. У Германіі, не гледзячы на ўвесь тэрор, пачынаец па новы рэволюцыйны пад'ём.

У барацьбе за тарыфныя стаўкі, супроць грабяжа дапамог і прымусовых збораў, за неабмежаваную свабоду выбараў незалежных заўкомаў, супроць падатковага грабяжа і ліхварскіх пошлін, супроць мілітарызацыі і тэрора, наша партыя падымае нянавісць супроць фашызма і выхоўвае ў рабочых масах волю да ўлады.

Мы прапагандуем сваю праграму социяльнага і нацыянальнага вызвалення, як адзіную праграму выратавання ад фашызма, голаду і вайны.

Мы прапагандуем палітычную масавую стачку, усеагульную забастоўку, узброенае паўстанне германскага рабочага класа за звяржэнне фашысцкай дыктатуры, за совецкую Германію. Вашы каласальныя социялістычныя перамогі з'яўляюцца для нас вагаром у барацьбе за ўладу. Бо яны паказваюць рабочым:

што комунізм з'яўляецца для іх адзіным паратункам;

што толькі адзінства рабочага класа на грунце марксізма-ленінізма прывядзе іх да перамогі;

што няма дэмакратычнага, «заходня-еўрапейскага» ці «нацыянальнага» социялізма; а ёсць толькі пролетарскі, інтэрнацыянальны социялізм;

што пабудова социялізма ў адной краіне магчыма і можа быць ажыццёўлена толькі пролетарскай рэволюцыяй, дыктатурай пролетарыята, совецкай уладай.

Прыклад Совецкага Саюза — гэта прыклад большэвізма. Пад кіраўніцтвам КПГ, якая, дзякуючы актыўнаму падтрыманню ВКП(б) і слаўнай рабоце нашага кінутага фашыстамі ў турму правадыра тав. Тэльмана, вырасла ў большэвіцкую партыю. Германскі пролетарыят уступіць на шлях рускай Окцябрскай рэволюцыі.

Комуністычная партыя Германіі ў брацкай салідарнасці вітае партыю Леніна пад кіраўніцтвам тав. Сталіна ў сувязі з XVII партыйным з'ездам і ўсклікае:

Няхай жыве большэвізм!
Няхай жыве Окцябр!
Няхай жыве совецкая ўлада!

Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі Германіі.

З ПРАМОВЫ ТАВ. БУБНОВА

Перыяд паміж XVI і XVII з'ездамі партыі,—гаворыць тав. Бубноў, — прадстаўляе сабою эпоху вырашэння раду важнейшых задач пролетарскай рэволюцыі. Перамогі, з якімі партыя падышла да свайго XVII з'езда, тлумачацца тым, што партыя, яе ленінскі ЦК і правадыр нашай партыі т. Сталін праводзілі непрэ[illegible] ад лею барацьбу з усімі ўхіламі контррэволюцыйнай лініі. Разгромлены ўсе тэны трацкізм, разгромлены аб неорыі правых кадовы социялізма ў магчымасці пабудоспехі, якія мы ма нашай краіне. Тым, што мы былі ем, тлумачацца свой рэволюцыйнай ўзброены перадыка пацвярдзіла аб тэорыяй. Пракізнасць высунутай салютную прэзідэнтай Сталіным тэо- Леніным і разве социялізма ў адрыі аб пабудзятай краіне.

Нізмерны фронце — таксама як культурным тках социялістычнага на ўсіх уча Яны тлумачацца тым, буржуазныя праводзіла прын што і тут большэвіцкую лінію, дацыйную больны адпор усім апючы сакрушэндэнцыям і палатыленінскіх разграміла трацжэнням Пяцю аб немагчымасці кісную тэорыю ўніцтва ў перы- культурнага б[illegible]

яд дыктатуры пролетарыята. Партыя разграміла тэорыю [illegible] аб тым, што перш чым [illegible] ладу ў свае рукі мы павінны стварыць сваю ўласную культуру. Вазьміце, нарэшце, [illegible] кую тэорыю [illegible] школы, якая [illegible] ў сутнасці [illegible] заду на [illegible] партызіма. У рэзультаце [illegible] нутай барацьбы з [illegible] шкімі класава-варожымі [illegible] лямі і тэарэтыкамі, мы маем [illegible] гутнае развіццё пролетарскай культуры, бурны ўздым на фронце культурнага будаўніцтва.

Асаблівасць культурнага ўздыму нашай краіны заключаецца тым, што гэты ўздым ахапіў [illegible] таральна ўсе ўчасткі культурнага будаўніцтва. Паказальнікамі гэтага ўздыму з'яўляюцца: амаль па галоўная пісьменнасць насельніцтва Совецкага Саюза, аграмадная пашырэнне і ахоп тэхнічнай і эканамічнай пісьменнасцю рабочых і калгасных мас, бурны рост школ, не менш бурны рост тэатраў, клубаў, бібліятэк і т. д. і т. д. Асабліва трэба падкрэсліць рост нашай навукі, навуковых установаў, пастаўленых на службу справе пабудовы социялізма ў нашай краіне.

Спыняючыся на паасобных участках нашай культурнай работы, я перш за ўсё хачу далажыць XVII партыйнаму з'езду, — гаворыць тав. Бубноў, — што тое рашэнне, якое вынес XVI партыйны з'езд аб увядзенні ўсеагульнага пачатковага навучання, нашы выканана.

Калі мы возьмем бюджэты ўсіх саюзных рэспублік за гэтыя гады, то мы ўбачым, што ў іх з года ў год растуць расходы на народную асвету. Усяго на народную асвету за прайшоўшае пяцігоддзе мы расходвалі 19,5 млрд. рублёў. Калі ў 1913 годзе расход на народную асвету на адну душу насельніцтва складаў усяго 1 р. 73 к., то ў 1932 годзе ён дасягнуў 38 р. 54 к.

Тав. Бубноў прыводзіць цікавае параўнанне выдаткаў на народную асвету ў нас і ў Германіі. Калі ў нас расходы на народную асвету з года ў год павышаюцца, то ў Германіі, напрыклад, па гораду Лейпцыгу, мы маем такі малюнак: 1929 годзе на ўтрыманне гарадскіх школ было расходвана 270 тыс. марак, а ў 1932 годзе — толькі 25,5 тыс. марак.

У галіне навуковай мы маем значны рост навуковых установаў, даследчых інстытутаў, лабараторый і інш., мы маем, што асабліва важна, велізарныя дасягненні ў напрамку набліжэння навукі да справы социялістычнага будаўніцтва. Найбольш яркім пацвярджэннем гэтага палажэння з'яўляецца Акадэмія Навук, работа якой [illegible] равана на вырашэнне задач, якія выцякаюць з ходу социялістычнага будаўніцтва ў краіне.

Вялікія нашы поспехі ў галіне мастацтва ўсіх відаў. Растуць нашы ўласныя кадры пролетарскіх мастакоў, пісьменнікаў, музыкантаў. Небывалы размах атрымала за апошнія гады сетка культурна-асветных установаў вёскі. Асабліва здзіўляючыя нашы дасягненні на культурным фронце ў нацыянальных рэспубліках і абласцях, параўнальна з той векавой адсталасцю, цемраю і невуцтвам, якія былі характэрны для гэтых раёнаў у дарэволюцыйны час.

Я ўпэўнен, што, ператвараючы ў жыццё ўсе дырэктывы партыі, указанні правадыра партыі тав. Сталіна, мабілізуючы вакол гэтых рашэнняў найшырэйшыя масы рабочых і калгаснікаў, мы прыдзем к наступнаму партыйнаму з'езду з новымі, гіганцкімі дасягненнямі на фронце культурнага будаўніцтва нашай краіны. **(Апладысменты).**

XVII З'ЕЗД ВКП(б)

Спрэчкі па справаздачнаму дакладу т. СТАЛІНА аб рабоце ЦК ВКП(б)

З ПРАМОВЫ тав. КОСАРЭВА

Тав. Косарэў, спатканы бурнымі воўгімі апладысментамі ўсяго зала, пачынае сваю вялікую змястоўную прамову з падкрэслівання таго факта, што нашы поспехі, поспехі, якімі кожны член партыі можа ганарыцца, дасягнуты намі ў самай жорсткай барацьбе з тымі, хто адыходзіць ад правільнай партыйнай лініі. Мы павінны яшчэ больш павысіць нашу пільнасць і настарожанасць, правяраючы заявы былых апазіцыянераў рэзультатамі іх практычнай работы.

На XVI з'ездзе партыі, — гаворыць далей тав. Косарэў, — тав. Сталін заявіў, што ленінскі комсамол і кіруемая ім рабочая моладзь увянчалі справу социялістычнага будаўніцтва рашаючымі поспехамі.

З гонарам мы можам сёння на XVII партыйным з'ездзе заявіць, што апраўдалі ацэнку нашага настаўніка і правадыра. Пад кіраўніцтвам партыі, дзякуючы ўвазе і клопатам яе ленінскага Цэнтральнага Камітэта і асабіста тав. Сталіна, ленінскі комсамол дабіўся значных поспехаў.

Тав. Косарэў прыводзіць рад цікавейшых лічбаў, ярка ілюструючых велізарныя поспехі ВЛКСМ. Мы маем зараз 4,5 млн. комсамольцаў.

У складзе комуністычнага союза моладзі мелі месца за апошнія гады аграмадныя якасныя зрухі.

К моманту XVI партз'езда мы мелі ў сельскіх арганізацыях комсамола ўсяго толькі 26 проц. калгаснікаў. К XVII з'езду лік комсамольцаў-калгаснікаў дасягнуў 93 проц. усёй сельскай комсамольскай арганізацыі. Вясковы комсамол стаў калгасным комсамолам і поруч з партыяй паспяхова змагаецца за рэалізацыю вялікага сталінскага лозунга аб большэвізацыі калгасаў і калгаснай заможнасці.

Вялікія поспехі комсамола і на фронце вучобы. У ВТНУ, тэхнікумах, рабфаках навучаецца зараз 523.000 комсамольцаў.

У велізарнай ступені вырасла ўдзельная вага кіруемай комсамолам рабочай моладзі ў барацьбе за індустрыялізацыю краіны. Лік комсамольцаў у прамысловасці і на транспарце за апошнія гады вырас з 680 тыс. да 1.300 тыс. Па радзе буйнейшых заводаў і новабудоўляў рабочая моладзь складае палову ўсяго ліку рабочых.

Нашы маладыя рабочыя кадры ў аспоўнай сваёй масе прайшлі школу ФЗВ, сярод іх расце з тым усё больш і больш расце процант таварышоў, атрымаўшых сярэднюю асвету. На «Красном треугольнике», напрыклад, сярэднюю асвету атрымала палова ўсіх маладых рабочых.

Наш малады рабочы — гэта рабочы новага тыпу, рабочы, які прыходзіць па вытворчасць узброены ведамі. Гэта падрыхтоўка аблягчае яму авалоданне тэхнікай. У барацьбе за аўладанне тэхнікай ленінскі комсамол дабіўся значных поспехаў. Ён высунуў новую, вышэйшую форму социялістычнага спаборніцтва — грамадска-тэхнічны экзамен. Праводзячы грамадска-тэхнічныя экзамены, мы дабіваемся ўзорнай культуры працы, узорнага скарыстання тэхнікі, павялічэння выпрацоўкі, зніжэння браку і процанта паломак, рэзкага зніжэння сабекошту. На жаль, ініцыятыва комсамола ў гэтай справе не падхоплена профсоюзамі, і трэба прама сказаць, што ў справе правядзення грамадска-тэхнічнага экзамена прафесіянальныя арганізацыі не толькі не дапамагаюць рабочай моладзі, не толькі не ўзначальваюць яе ініцыятыву, але пляцуцца ў хвасце.

Мы змагаемся зараз, — гаворыць далей тав. Косарэў, — за высока тэхнічна-пісьменнага маладога рабочага. Мы хочам, каб рабочая моладзь дасканала аўладала машыннай тэхнікай на заводах, шахтах, калгасах і соўгасах, каб малады рабочы дасканальна вывучыў свой матор, свой трактар, каб ён добра ведаў хімію і матэматыку.

Перайшоўшы да пытанняў вясковай работы, тав. Косарэў гаворыць, што ЦК партыі грунтоўна і зусім справядліва раскрытыкаваў комсамол за недастатковую ўвагу вёсцы. Гэта крытыка ўжо дала пэўныя рэзультаты.

Нашы вясковыя арганізацыі значна выраслі і ўмацаваліся. На кожныя сто калгасаў налічваецца зараз прыкладна 48 комсамольскіх ячэек, а ў рашаючых сельска-гаспадарчых абласцях (Украіна, Паўночны Каўказ, Ніжняя і Сярэдняя Волга, Заходняя Сібір, нават 70 ячэек.

Як мы расстаўляем у калгасах свае сілы? Для таго, каб адказаць на гэта пытанне, спашлюся на даныя 651 палітаддзела. У калгасах, ахопленых работай гэтых палітаддзелаў, налічваецца: 550 комсамольцаў — старшынь калгасаў, 400 — загадчыкаў таварнымі фермамі, 3.000 рахункаводаў, 13.268 трактарыстаў, 1.000 камбайнераў. На асобных абласцях комсамольцы складаюць 41 проц. усіх трактарыстаў, 60 проц. усіх камбайнераў. Як бачыце, мы павярнуліся тварам да калгаснай вытворчасці, навучыліся пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК партыі правільна расстаўляць свае сілы. Аднак, у нас яшчэ ў калгасе — непачаты край работы. Мы яшчэ не сталі — гэта трэба сказаць — у МТС, калгасе і соўгасе такой-жа арганізуючай сілай, як і на заводзе.

Далей тав. Косарэў падрабязна спыняецца на партыйным кіраўніцтве комсамолам і на ідэйна-выхаваўчай рабоце сярод комсамольцаў. Мясцовыя комсамольскія арганізацыі скардзяцца на тое, што партыйныя камітэты аказваюць ім не дастатковую дапамогу. На мясцах часамі забываюць, што ідэйна-выхаваўчая работа з комсамольцамі — гэта ў той-жа час і барацьба за якасць маладых партыйных кадраў. Мы-ж за апошнія гады перадалі ў партыю 375.000 комсамольцаў. Палітыка-выхаваўчая работа ў комсамоле, — падкрэслівае тав. Косарэў, — справа ўсёй партыі. Комсамол адзін з гэтай справай не справіцца.

Тав. Косарэў у заключэнне запэўняе XVII з'езд, запэўняе ўсю партыю, што калі імперыялісты адважацца напасці на Совецкі Саюз, комсамол дасць Чырвонай арміі мільёны самых вытрыманых, самых смелых байцоў, якія, натхнёныя імем вялікага Сталіна, натхнёныя ідэяй абароны краіны пераможнага социялізма, пакажуць на фронце прыклады адвагі і геройства.

— Будзьце ўпэўнены, — заканчвае пад бурныя, доўгія апладысменты тав. Косарэў, — што ўся рабочая моладзь пад кіраўніцтвам партыі атрымае на ваенным фронце такія-ж перамогі, якія яна атрымала і атрымлівае на мірных франтах.

З ПРАМОВЫ ТАВ. ЯКАЎЛЕВА

Тав. Я. А. Якаўлеў у пачатку сваёй прамовы гаворыць: — Труднасці, з якімі мы за апошнія гады ў народнай гаспадарцы сустрэліся, пераможаны намі, дзякуючы мудрасці ленінскаму кіраўніцтву Цэнтральнага Камітэта і перш за ўсё т. Сталіна, здолеўшага загадзя выкрыць усе манеўры класа нашага ворага, чым - бы ён не прыкрываўся, як-бы ён не маскаваўся. Прамова т. Сталіна на студзеньскім аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК увойдзе ў гісторыю класавай барацьбы, як ленінскі узор ленінскай стратэгіі і тактыкі. Тав. Сталін у сваім справаздачным дакладзе XVII з'езду ўзяў пад суровую і справядлівую крытыку работу земельных органаў. Я яшчэ памылкай Наркамзема, што ён не здолеў з пістарычнай ступенькай прамовы тав. Сталіна адразу зрабіць усе належныя высновы ў сэнсе змянення работы земельных органаў, рашучага перамацання бюракратычнай закасцянеласці старой земельнай машыны. Абсалютна правільна т. Сталін таварыў аб капітуляцыя-бюракратычных метадах кіраўніцтва ў сістэме Наркамзема.

Характэрнай асаблівасцю гэтага кіраўніцтва з'яўляецца цыркулярнічына, кіраўніцтва «наогул» праз загады і дырэктывы, адрасуемыя «усім, усім, усім». А такія агульныя загады і дырэктывы, як мы добра яны ні былі ў іншых выпадках складзены, не дасягаюць мэты, не даюць практычных рэзультатаў. Агульны загад — упар ухаластую, калі не арганізаванае суровая праверка таго, як ён на месцах, ва ўмовах кожнай дадай МТС, кожнага данага калгаса выконваецца.

Мы павінны зараз у сельскай гаспадарцы, як і ў прамысловасці, канцэнтраваць кіраўніцтвам кожным у дасабку канкрэтным прадпрыемствам. Пасылаць у МТС, якая ўжо даўно закончыла рамонт трактароў, цыркулярную дырэктыву аб необходнасці як мага хутчэй адрамантаваць трактары, гэта не кіраўніцтва, а здзек над кіраўніцтвам.

Тав. Якаўлеў на радзе фактаў паказвае, якое рашаючае значэнне ў рабоце земельных органаў мае праверка выканання. Дырэктар Лічаўскай МТС (Украіна) паведамляе тав. Якаўлеву, што асобы, ніваватыя ў перарасходзе гаручага, звяты з работы і прыцягнуты да адказнасці. Між тым, цэлы месяц Наркамзем атрымаў ад інспектара, які правяраў Лічаўскую МТС, паведамленне аб тым, што раскрадальнікі гаручага не толькі не ацэнены пад суд, але што перарасход шляхам усякага роду бухгалтарскіх махінацый старанна замаскаваны. Дырэктар гэтай МТС аддадзены пад суд.

Вясновая МТМ выпускае на працягу трох месяцаў 26 матароў, пяцібрыгадная адрамантаваных. Вінаватых суд прысудзіў да суровага пакарання.

Варта было пасля гэтага грамадна-тэхнічнаму інспектару пацвярдзіць самы кароткі тэрмін у гэтай МТМ і яна стала пачынаць выпускаць 3-4 зусім добраякасна адрамантаваныя маторы.

Буйнейшым недахопам, у рабоце мясцовых земельных органаў з'яўляецца тое, што яны не сілі лізуюць цэнтру аб сапраўдным становішчы справ на месцах.

— Мы, заўважае тав. Якаўлеў, — давяраемся аб прарыве ў сельскай гаспадарцы той або іншай вобласці, таго або іншага краю ад ЦК партыі, ад Совнаркома, сваёй па сутнасці на месца, але не ад мясцовага земельнага апарата.

Тав. Якаўлеў падрабязна спыняецца на пытанні аб падборы людзей для земельнага апарата. У 1933 годзе праведена вялікая работа па чыстцы земельных органаў, па вычышчэнню з іх чужакоў і бюракратаў. Вычышчаны дзесяткі тысяч людзей чысткай, аднак, як-бы яна ўдала ні была праведзена, яна не вычэрпваецца пытанне аб кадрах у земельнай сістэме. На змену вычышчаным трэба падабраць новых работнікаў, поўнасцю нашых людзей.

Тав. Якаўлеў даказвае аб тым метадзе індывідуальнага падбору людзей, які НКЗ прыняў у адносінах да новых МТС. У нас зараз ёсць усе магчымасці для абнаўлення і ўмацавання земельнага апарата. Гэтыя магчымасці даюць: 1) палітаддзелы, 2) перакідка на месцы з дапамогаю ЦК некалькіх тысяч моцных работнікаў самой земельнай сістэмы, 3) тое, што маладых совецкіх спецыялістаў мы зараз палкам накіроўваем на работу ў МТС.

Памяркоўнасці земельнага апарата перакідкай на месцы новых работнікаў, мы павінны ўзмацаваць яго вылучэннем і прасоўваннем лепшых мясцовых людзей. А такіх людзей ёсць, і іх зараз ужо вымала. Калгасы і МТС вылучылі ўжо моцныя гаспадарчыя кадры, вылучылі сапраўдных майстроў социялістычнага ўкладжаю. Тав. Якаўлеў прыводзіць рад прыкладаў.

Памяркоўнасці падбору людзей, памяркоўнасці і ўмацавання кадраў, вялікарнае значэнне для адладжанай работы земельнай сістэмы мае таксама змяненне яе арганізацыйнай структуры. Наркамзем Саюза сумесна з сельгаседзелам ЦК распрацаваў праект такога змянення, у аснове якога палажэнне на рашучая ліквідацыя функцыяналкі, пабудова апарата па вытворча-тэрытарыяльнаму прынцыпу.

Тав. Якаўлеў падрабязна спыняецца далей на пытаннях жывёлагадоўлі. Ён падкрэслівае, што мы маем зараз у палітаддзелах усе даныя для таго, каб забяспечыць социялістычнай жывёлагадоўлі бурны рост.—Даклад т. Сталіна на XVII з'ездзе — гаворыць т. Якаўлеў — мабілізуе ўсю партыю на ліквідацыю нелахопаў у жывёлагадоўлі, і таксама як гістарычная сталінская прамова на кастрычніцкім пленуме 1933 г. заклікала яе да ліквідацыі прагалаў у збожжавай гаспадарцы. Неабходна, каб усе мясцовыя земельныя органы, усе мясцовыя арганізацыі адклалі жывёлагадоўлі сто, чым ж увагі, колькі яны адводзяць палаводству.

Кожны калгаснік, кожны ударнік павінен вывесці. Найбольш быстрарост можа і павінна даць свіноўгадоўля. Гэта-ж факт, што на доўгай калгаснай ферме адна свіння дае ў год 60 пудоў прыплоду. Трэба дабіцца максімальнага прыплоду ад кожнага жывёлы.

Далей тав. Якаўлеў даказвае аб тым, што арганізацыйных мерапрыемствах, якія необходна правесці ў галіне жывёлагадоўлі.

Тав. Якаўлеў спыняецца далей на пытаннях старыстання машын і тэхнікі ў сельскай гаспадарцы, павышэння ўрадлівасці, падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

— Нашу справу—заканчвае тав. Якаўлеў пад апладысменты залы, — пераможна вядзе наперад вялікі правадыр тав. Сталін, і ў гэтым — заруха пасяховага перамагання ўсіх трудасцяй.

З ПРАМОВЫ тав. КРЫНІЦКАГА

— Даклад т. Сталіна гаворыць аб велізарных перамогах партыі, ленінскай палітыкі ў социялістычным будаўніцтве Саюза і міжнародных адносінах. Усе канферэнцыі—гарадзкія, раённыя, маскоўская, ленінградская, з'езд большэвікоў Украіны—гавораць аб велізарным росце сіл і магутнасці нашай партыі. Імя т. Сталіна—гэта сцяг барацьбы за комунізм. Яно блізка і дорага ўсім працоўным. Уся краіна з захватваючай увагай сочыць за работай з'езда, бо з'езд адкрывае новую главу ў будаўніцтве социялізма.

Тав. Крыніцкі падрабязна спыняецца на чарговых задачах калгаснага будаўніцтва. Павышэнне прадукцыйнасці працы ў калгасах было, ёсць і астанецца асноўнай эканамічнай і палітычнай задачай. За мінуўшы перыяд для гэтага створаны ўсе прадпасылкі. Калгасны лад перамог, як вышэйшая форма буйнага земляробства; расце яго магутная перадавая тэхнічная база. Аднак арганізацыя вытворчасці і працы ва многіх калгасах яшчэ не адпавядае социялістычнаму тыпу вытворчасці і ўзроўню перадавой тэхнікі калгасаў. Узорная арганізацыя працы—рашаючая ўмова для выканання задач, аб якіх гаварыў у сваім дакладзе тав. Сталін.

Пасля студзеньскага пленума ЦК, пасля прамовы т. Сталіна партыя ўзялася за ўмацаванне сельскай гаспадаркі. Былі створаны палітаддзелы. Прароблена вялікая работа па палітычнаму і арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў. Далейшае падняцце калгасаў, як гаспадарчых арганізмаў, правільнае вырашэнне арганізацыйных пытанняў, рост вытворчасці цалкам залежаць ад нас. Трэба скарыстаць унутраныя рэзервы для павышэння прадукцыйнасці працы, ператварэння калгасаў у большэвіцкія, а калгаснікаў—у заможных.

Гэтыя ўнутраныя рэзервы заключаюцца, галоўным чынам, у наступным: 1) правільная арганізацыя людзей для скарыстання поўнай магутнасці трактароў, камбайнаў і іншых машын; 2) далейшае ўмацаванне і ўдасканаленне ўнутранай структуры калгасаў; 3) правільная арганізацыя рабочага дня ў калгасе; 4) нармаванне расцэнак працы, здзельшчына, даход па працаднях; 5) правільная арганізацыя тэрыторыі калгаса; 6) арганізацыя калгаснага транспарта; 7) правільная пастаноўка планавання калгаснай вытворчасці.

Асаблівае значэнне набывае планаванне. Барацьба за павышэнне ўраджайнасці, развіццё жывёлагадоўлі, дапаможных галін гаспадаркі і інш. — усё гэта патрабуе стройнага плана. Правільная арганізацыя стана, парэзка клетак, арганізацыя дадатковага падкорма коняй, чарганне невялікіх перарываў у баразне — усе гэтыя дробныя на першы погляд мерапрыемствы могуць і павінны даць велізарны эфект.

Нельга сказаць што пастаянная брыгада ў калгасе ўжо даволі ўмацавалася. Не склад яшчэ хістаецца. Брыгада не скарыстоўвае правільна сваёй рабочай сілы. Няма роўнамернай нагрузкі. У нармаванні расцэнак працы — самацёк.

Пытанні арганізацыі вытворчасці і працы ў калгасе — пытанні вострай класавай барацьбы, пытанні барацьбы за большэвіцкія калгасы, за социялістычнае перавыхаванне калгаснікаў у свядомых работнікаў буйнай социялістычнай гаспадаркі.

Арганізацыя працы ў двухстах тысяч калгасах патрабуе большэвіцкай работы, велізарнага напружання. Гэта — вялікі ўчастак барацьбы за знішчэнне працілегласці паміж горадам і вёскай. Гэта работа павінна стаць цэнтральнай ва ўсёй сістэме Наркамзема.

Але зараз гэтыя пытанні закінуты і ў Наркамземе, і ў мясцовых земельных органах. Гэтай справай больш займаюцца абкомы і крайкомы і сельгаседзел ЦК.

Велізарную арганізатарскую ролю ў барацьбе за магутную калгасную вытворчасць адыгралі палітаддзелы. Тав. Сталін даў ацэнку іх работы. Гэта ацэнка напаўняе новай энергіяй, бадзёрасцю работнікаў палітаддзела, узбройвае ўсведамленнем таго, што яны выконваюць задачы, пастаўленыя тав. Сталіным.

У чым сіла палітаддзелаў? У тым, што яны працуюць стылем Леніна, Сталіна, змагаюцца за справу так, як гэтаму вучыць тав. Сталін.

Вылучэнне велізарнай колькасці загартаваных большэвікоў у палітаддзелы гаворыць аб магутнасці нашай партыі. Зроблена велізарная перасоўка людзей у калгасах. Падабраны новыя кадры, перш за ўсё з ударнікаў. Палітаддзелы працавалі па-ўдарнаму і паднялі высока ў вёсцы сцяг социялістычнага спаборніцтва. Лік ударнікаў вырас за год удвая. У палітаддзелах створана 2.153 друкаваных газет. На кожную газету прыходзіцца ў сярэднім 62 селькоры. Арганізатарская работа палітаддзелаў відна ў справе выхавання актыва, у справе заваявання большасці ў калгасах.

Наперадзе яшчэ больш цяжкія задачы: праблема жывёлагадоўлі, скарыстання трактароў, утнаення, узорнай арганізацыі працы і вытворчасці ў калгасах. Трэба хутчэй выправіць недахопы ў земельнай сістэме зверху данізу.

Заканчваючы сваю прамову, тав. Крыніцкі падкрэслівае, што XVII з'езд дае надзвычайную дамаскрацыю кіруючай ролі партыі, яе магутнасці і непарушнай арганічнай сувязі з масамі. На аснове рашэнняў з'езда працоўныя масы будуць пераможна змагацца за праграму другой пяцігодкі пад слаўным сцягам правадыра партыі т. Сталіна.

З ПРАМОВЫ тав. ЕНУКІДЗЕ

З'езд нашай партыі з велізарнейшай увагай выслухаў даклад правадыра партыі тав. Сталіна. Сёння гэты даклад з'явіўся ў друку і яго будуць таксама ўважліва вывучаць мільёны людзей. Гэты даклад падводзіць вынікі велізарнейшых перамог, атрыманых партыяй па ўсіх участках социялістычнага будаўніцтва, і дае праграму работ сусветна-гістарычнага значэння на будучы адрэзак часу.

Тав. Сталін зрабіў свой даклад 26 студзеня. Роўна дзесяць год таму назад—у гэты дзень і гадзіну тав. Сталін даў над трупою вялікага правадыра і заспавальніка нашай партыі — тав. Леніна клятву выканаць усе яго заветы. Тав. Сталін з велізарнейшым гонарам выканаў сваю клятву. У гэтым—нязмерная веліч правадыра нашай партыі, мудрага Сталіна. Даволі ўспомніць нядаўнае мінулае, каб зразумець, якую цвёрдасць, якую вернасць прынцыпам ленінскай партыі, якую непрымірымасць да ўсякіх ухілаў ад ленінскай лініі трэба было праявіць правадыру партыі, каб дабіцца тых поспехаў, з якімі прышла наша партыя да свайго з'езда. Нязмерна вялікая заслуга тав. Сталіна ў галіне далейшага развіцця марксісцка-ленінскай тэорыі. Працы тав. Сталіна па пытанню індустрыялізацыі і калектывізацыі, па пытаннях дыктатуры пролетарыята, нацыянальнаму пытанню, арганізацыйных пытаннях будаўніцтва партыі, нарэшце, яго апошні даклад на гэтым з'ездзе—усё гэта ўвойдзе ў скарбніцу марксісцка-ленінскага вучэння і будзе служыць магутнай зброяй для нашай далейшай работы, будзе кіраўніцтвам да дзеяння для пролетарыяў усяго свету.

Тав. Сталіна мы ведаем, як найвялікшага арганізатара, які забяспечыў нам цяперашнія перамогі. Гаворачы аб Сталіне, як аб права дыры нашай партыі, я не магу абыйсці маўчаннем яго найвялікшага арганізатарскага таланта ў справе падбору людзей. Тав. Сталін здолеў акружыць сябе лепшымі людзьмі нашай партыі, здолеў сумесна з імі абмяркоўваць і вырашаць усякія пытанні, здолеў і з гэтай групы людзей стварыць такую магутную сілу, якой не ведала гісторыя ні адной рэволюцыйнай партыі.

Я хацеў-бы, — гаворыць тав. Енукідзе, — спыніць увагу дэлегатаў на некаторых момантах даклада тав. Сталіна. Перш за ўсё я лічу, што асноўную ўвагу ў нашай далейшай рабоце мы павінны аддаць пытанням якасці прадукцыі і галоўнае — прадукцыі заводскай. Мне хацелася-б звярнуць увагу з'езда па рад недахопаў у нашым электраабсталяванні, калі з-за раду недахопаў, мы маем значны перарасход у гэтай справе. Другое пытанне, на якім я хачу спыніцца, гэта — догляд машын. Тав. Сталін падкрэсліваў тут пытанне скарыстання трактароў. Пытаннем рамонту дробнага, сярэдняга нашых машын мы павінны аддаць вялікую ўвагу. Надзвычайна неэканомна мы абыходзімся з апалам. У нас ёсць яшчэ вялікі перарасход на вугалю, дровах і асаблива па вадкаму апалу. Захоўваючы найстражайшую эканомію ў апале, беражна яго расходуючы, мы з'эканомім краіне мільёны рублёў і мільёны тон апалу.

Правільная арганізацыя працы, умелая расстаноўка сіл, праверка выканання — адным словам, уся сума арганізацыйных мерапрыемстваў, забяспечваючых правядзенне ў жыццё ўсіх вялікіх задач, высунутых тав. Сталіным — вось на які бок справы мы павінны звярнуць сваю асаблівую ўвагу.

Асаблівую ўвагу мы павінны звярнуць на ўмацаванне органаў совецкай улады.

У канцы года будзе праводзіцца перавыбарчая кампанія советаў, якая завяршыцца сёмым усесаюзным з'ездам советаў.

Сёмы ўсесаюзны з'езд советаў падводзе вынікі нашых перамог за прайшоўшыя гады і намеціць праграму далейшай работы.

Таварышы! Наша партыя моцная, згуртаваная, маналітная, як ніколі. Многа труднасцяй прадстаіць яшчэ нам наперадзе, але ў нашай партыі закладзены найвялікшыя сілы і гэтыя сілы служаць зарукай таго, што мы пабудуем з вамі бясклассавае социялістычнае грамадства і прыдзем да наступнага з'езда з гіганцкімі дасягненнямі як на фронце гаспадарчага, так і на фронце культурнага будаўніцтва нашай краіны. (Доўгія апладысменты).

З ПРАМОВЫ тав. Н. І. БУХАРЫНА

Прадпасылкай перамог нашай партыі з'явілася выпрацоўка Цэнтральным Камітэтам і тав. Сталіным надзвычайна правільнай генеральнай лініі, апаратыўнае і мужнае правядзенне гэтай лініі, бязлітасны разгром усіх апазіцый і правай апазіцыі, як галоўнай небяспекі, той апазіцыі, да якой раней належаў я сам,—указвае тав. Бухарын.

— У правых,—гаворыць ён,— да якіх я належаў, была другая палітычная лінія, лінія — супроць разгорнутага социялістычнага наступлення, супроць новага штурму, на які наша партыя ішла. Ясна, што гэта лінія мела на ўвазе другія тэмпы развіцця, што яна была фактычна супроць фарсіраванага разгортвання індустрыялізацыі, супроць рашучай барацьбы з кулацтвам, супроць ліквідацыі кулацтва як класа, супроць рашучага курса на пераробку дробнай сялянскай гаспадаркі. Гэта лінія азначала адступленне перад труднасцямі класавай барацьбы, якая

Лінія правых страецца.

супроць новага была накіравана на социялістычнага этапа разгортвання. Правыя не разумелі наступленняй необходнасці ці яго гістарычныя вывады, якія рабілі палітычнаму ацэньваць, як анты нельга інакш вады, якія прыводзілі ленінскія вычайна адмоўных паілі да надзвылеследваў.

Тав. Бухарын указ літычных пасрамога гэтага ўхіла вае, што пе-вязала-б «трэцюю сімінуча разла-б да крайнасці палу», аслабіла класа, прывяла-б ніцы рабочацы капіталізма. Тавда растаўранайлепшы выразіце. Сталін, як цоль партыйнай ліпь і натхнірамогу ва ўнутрыц, атрымаў рацьбе па глыбокагартыйнай бавых асновах ленінск прынцыпоіменна на гэтай асі палітыкі і

ве ён атрымаў гарачае падтрыманне партыі і рабочага класа. Рашучы разгром гэтай апазіцыі, як і разгром трацкістаў і разгром так званай ленінградскай апазіцыі, быў необходнай прадпасылкай паспяховага социялістычнага наступлення.

Тав. Бухарын указвае, што т. Сталін быў цалкам праў, калі, бліс куча прымяняючы маркса-ленінскую дыялектыку, разграміў цэлы рад тэарытычных прадпасылак пра нага ўхіла, фармуляваных перш за ўсё самім т. Бухарыным: так званую тэорыю роўнавагі, тэорыю так званага арганізаванага капіталізма, тэорыю мірнага ўрастання ў социялізм капіталістычных элементаў, тэорыю затухання класавай барацьбы і тэорыю аб тым, што таваразварот і рынак ёсць рашаючы, асноўны шлях перапрабкі сялянскай гаспадаркі.

Абавязкам кожнага члена партыі,—гаворыць тав. Бухарын, — з'яўляецца барацьба з усімі антыпартыйнымі групоўкамі, актыўная і бязлітасная барацьба з імі—незалежна ад якіх-бы там ні было ранейшых асабістых сувязяй і адносін, згуртаванне вакол ЦК і тав. Сталіна, як увасабляючага ў сабе розум і волю ўсёй партыі, як яе кіраўніка, яе тэарытычнага і палітычнага правадыра.

Далей т. Бухарын спыняецца на якасных і колькасных зменах у галіне прадукцыйных сіл, эканамічных адносін, культуры і т. д. Ён указвае, што рост матэрыяльных прадукцыйных сіл знаходзіць сваё найбольш агульнае выражэнне ў электрыфікацыі СССР, а затым у масе новага тыпу машын і апаратуры, агромнай колькасці новых варштатаў апаратаў і ўстановак у хімічнай прамысловасці, цэлых новых галінах вытворчасці, у патоку новых сельска-гаспадарчых машын і т. д. Сапраўды гіганцкі скачок мы маем у вёсцы ад сахі, бараны, грабель—да трактара, камбайна, да складаных сельска-гаспадарчых машын.

У галіне колькаснага і якаснага росту людскіх прадукцыйных сіл у наяўнасці агульны масавы падём культурнасці і тэхнічных кваліфікацый.

Выраслі побач з матэрыяльнымі прадукцыйнымі сіламі і навуковыя прадукцыйныя сілы: краіна пакрылася сеткай навукова-даследчых інстытутаў. Лабараторыі на прадпрыемстве, якія раней налічваліся адзінкамі, зараз—звычайная з'ява на заводзе і фабрыцы; вырасла ў велізарнай ступені колькасць праектных арганізацый, канструктарскіх бюро, даследчых заводскіх установак, даследчых сельска-гаспадарчых станцый. Усё гэта аказалася магутным вагаром для буйнейшых дасягненняў у галіне навукі і тэхнікі: па алюмінію, спецыяльных сталях, апатытах, нефелінах, сінтэтычнаму каўчуку, газіфікацыі нафты, новых самалётах і маторах і т. д. На гэтай базе ў нас пачаў з'яўляцца новы тып тэхніка-культурнага завода, які паладжвае навукова тэхнічную службу на прадпрыемстве, накапляе тэхнічную дакументацію завода, адкладваецца ўвесь заводзі... нічны вопыт, складае і ... у жыццё тэхпромфінп... ле работу рыўкамі ... дакладнаму графіку, стэматычную работ... асваенню тэхнікі...

Тав. Бухары... лей на караў... эканомікі, ас... перарасходе ... больш ця... цыялізм... барацьб... турны... Пе... кі,

...ка
...ірэста
...ычыны

...ЦАНА
...ванДавіча
...не спачуванне
...сім).

Упаўн. Гал...

...ноўкі: пафас асваення, які дапаўняе пафас будаўніцтва, лёгкую індустрыю, транспарт і таваразварот.

Потым, адзначаўшы буйныя поспехі партыі ў знешняй палітыцы, тав. Бухарын гаворыць, што ў даны момант існуюць два плацдармы контрэволюцыйнага нападу, накіраванага супроць нас: фашысцкая Германія і імператарская Японія. Цытуючы выказванні Розенберга, Аракі і інш., якія прапаведуюць адкрыта адарванне мячом земляў СССР, а таксама рад «навуковых» прац фашыстаў, у якіх аплёўваюцца лепшыя дасягненні навукі і вядзецца прапаганда зоалагічнага драпежніцтва, варварства і панажоўшчыны, Бухарын заўважае:

— Вось — звярынае аблічча класавага ворага, вось — хто стаіць перад намі, вось — з кім мы павінны будзем, таварышы, мець справу ва ўсіх тых грандыёзных гістарычных бойках, якія гісторыя ўскладала на нашы плечы. Мы—адзіная краіна, якая ўвасабляе прагрэсіўныя сілы гісторыі. Наша партыя і асабіста тав. Сталін, гэта — наймагутнейшы гламатай не толькі эканамічнага, але ... тэхнічнага і навуковага прагрэса на нашай планеце. Для надыхо... ячых бацёў неабходна перш за ... ё згуртаванне ўсіх сіл рэволю... і.

...тав. Бухарын заканчвае сваю ...ову наступнымі словамі:

...Далоў усякіх дазарганізата... ...ай жыве наша партыя, ...баявое таварыства, ...загартаваных байцоў, ...таль, мужных рэво... ...заваюць усе ...ствам слу...ня... ...пролетарскіх ...тав. Ста-

Соцыялістычны ўклад кепадзельна пануе на ўсіх без выключэння ўчастках народнай гаспадаркі

„МЫ ДАБІЛІСЯ ТАГО, ШТО АСНОЎНЫЯ ПЫТАННІ ПРАМЫСЛОВАСЦІ ВЫРАШАНЫ ПРАВІЛЬНА І ПРАМЫСЛОВАСЦЬ СТАЦЬ ЗАРАЗ ЦВЁРДА НА НАГАХ. МЫ ДАБІЛІСЯ ТАГО, ШТО АСНОЎНЫЯ ПЫТАННІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ТАКСАМА ВЫРАШАНЫ ПРАВІЛЬНА І СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА—МЫ МОЖАМ СКАЗАЦЬ ГЭТА ПРАМА,—ТАКСАМА СТАЦЬ ЗАРАЗ ЦВЁРДА НА НАГАХ“ (СТАЛІН)

СТРЫМАЦЬ СВАЁ СЛОВА

Сотні рабочых і работніц завода імя Мяснікова толькі што закончылі працу. Яны сабраліся сюды, каб пачуць хоць кароткі змест таго, што гаварыў на XVII з'ездзе ВКП(б) капітан краіны Совецкаў тав. **Сталін.**

Сталоўка з'не яркімі лозунгамі і плакатамі. Небывалая радасць на тварах рабочых-ударнікаў і энтузіязм сведчыць аб тым, з якой сілай і жаданнем яны сустракаюць XVII з'езд партыі. Усе зацікаўлены, шмат хто ўпіўся ў шырокія палотнішчы газет з дакладам тав. Сталіна.

Бадзёры спеў дзяўчат гулка прарэзае шум. На трыбуне дакладчык тав. **Ашаровіч** коратка перадае змест даклада тав. Сталіна. Рабочыя завода надзвычай уважліва слухаюць да клад.

Рабочыя завода імя Мяснікова далі моцнае абяцанне выканаць датэр мірова лютаўскую праграму. Усім рабочым здаць тэхэкзамен на «добра» і «вельмі добра». Узмацніць справу ваенізацыі і здаць порму на значок лепшага варашылаўскага стралка. Арганізаваць масавы збор рацыяналізатарскіх прапаноў. Цэхсталоўку зрабіць узорнай. Павялічыць каларыйнасць абедаў.

Завод уключыўся ў сталінскі паход імя XVII партыйнага з'езда. Заключыў соцспаборніцтва паміж МБВ, Заходняй і Окцябрскай чыгункай. Заключыў соцдагавор з Гомельскім заводам імя Ланцуцкага.

Рабочыя-ударнікі з гонарам выканалі студзеньскую праграму на **102,1** проц. Арганізавана **15** сталінскіх брыгад.

На перадавую лінію соцыялістычнага спаборніцтва выйшлі: комсамольская брыгада па абнаўленню вагонаў тав. **Лапідуса**, якая выканала план на **108** проц. і вядзе змаганне за перадавую комсамольскую брыгаду па заводзе.

Брыгада кровельшчыкаў т. **Падабеда** не ведае прарываў у рабоце, перавыконвае сістэматычна промфін план. Студзеньскую праграму выканала на **105** проц.

Брыгада **Садоўскага** пры заданні выпуску **300** дошак за змену, дала сустрэчны — **350** і фактычна выканала **400** дошак.

Брыгада пад'ёмшчыкаў т. **Сабіла**, брыгада станочнікаў **Садоўскага** і інш. выканалі з гонарам усе абавязацельствы да XVII з'езда партыі.

Комсамольцы вагона-аборачнага цэха ў падарунак з'езду выпусцілі з рамонту пасажырскі вагон за № 4539.

Вагона-рамонтны завод імя **Мяснікова** ў падарунак з'езду выпусціў звыш плана два вагоны—адзін таварны і адзін пасажырскі. Рабочыя ў парадку соцабавязацельства ўстанавілі кампрэсар. Комсамольцы рамонтнага цэха ўстанавілі свідравальны варштат.

Завод з'эканоміў апалу за 25 дзён студзеня **12** проц. замест нормы **4,4** проц.

Рабочыя-ударнікі ўзялі на сябе абавязацельства здаць да 20 студзеня тэхэкзамен. Здало ўсяго **407** асоб. На «добра» і «вельмі добра» здалі **276** чалавек.

39 старых рабочых узялі індывідуальнае шэфства над маладымі рабочымі. Так, стары рабочы-прасоўшчык, які мае 37 год вытворчага стажу, навучае сваю падручную тав. **Тэлецицкую.** Стругальшчык **Скорабагаты** навучае чорнарабочую **Семянюк.** Маладыя вучні ўжо замацавалі вытворчы вопыт старых кадравікоў.

У фонд імя XVII з'езда ВКП(б) унесена **110** рацыяналізатарскіх прапаноў, з якіх 16 ужо рэалізаваны і даюць **1.500** руб. эканоміі ў месяц. Надзвычай каштоўная прапанова слесара тав. **Варэніка**—«новы спосаб загартоўкі разцоў да варштата «Рапід», дае эканамічны эфект да **900** руб. у год.

Прапанова тав. **Дзічкоўскага**, — «праект перакрыцця міжцэхаў для прыстасавання падстрэшкі дошак» дае эканамічны эфект **10.080** руб. у год.

Высокіх паказальнікаў у рабоце завод імя Мяснікова дабіўся, дзякуючы большэвіцкаму кіраўніцтву дарожнага і раённага палітаддзелаў, дзякуючы разгорнутай партыйна-масавай рабоце і павышэнню вядучай ролі комуністаў і комсамольцаў на аснове соцыялістычнага спаборніцтва з заводам імя Ланцуцкага.

Але, не гледзячы на рад далёкіх моментаў, якія дабіўся завод імя Мяснікова, мы маем на заводзе яшчэ недастаткова разгорнутую масавую работу і слабую барацьбу за ўмацаванне жалезнай працоўнай дысцыпліны, за паляпшэнне якасці работы. Такія рабочыя, як **Рубэшкін, Мірончык** і інш. сістэматычна даюць брак у рабоце.

У прэсоўным аддзяленні майстра **Шаблоўскі** не выканаў абавязацельстваў, узятых да XVII з'езда партыі.

Інжынер **Платонаў** не даў выразнай вытворчай праграмы для прэсоўнага аддзялення, у выніку чаго ўзятыя абавязацельствы аддзяленне не выканала.

Рабочыя завода імя Мяснікова ў адзнаку XVII з'езда партыі далі моцнае пролетарскае абяцанне выканаць і перавыканаць гадавую праграму 1934 г.

Мы, рабочыя-ударнікі, з яшчэ большай сілай і энергіяй будзем змагацца за якасць і тэмпы на аснове ўказанняў тав. Сталіна. Мы абяцаем глыбока і прадукцыйна прапрацаваць і правесці ў жыццё ўказанні, дадзеныя ў дакладзе тав. Сталіна і пастановы XVII з'езда ВКП(б)—так заявілі рабочыя завода імя Мяснікова на сходзе-мітынгу.

Г. Гайлевіч.

БАЯВАЯ ПРАГРАМА РАБОТЫ

ОРША, 29 (Па тэлефону).

Па ўсіх буйнейшых прадпрыемствах і навучальных установах раёна пачалася прапрацоўка даклада тав. **СТАЛІНА** на XVII з'ездзе ВКП(б) і вышэйшых ХУ з'ездаў КП(б)Б.

Сёння ў час абеднэвага перапынку заслухалі інфармацыю аб дакладзе т. **СТАЛІНА** рабочыя і ІТР механічнага завода **«Чырвоны барацьбіт»**. Асноўнымі па зместам даклада тав. Сталіна, рабочы калектыў завода з задаваленнем адзначылі тыя апрамасныя поспехі, якія пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі на чале з т. **СТАЛІНЫМ** да сягнуў СССР у барацьбе з капіталістычнымі элементамі і ўхіламі ад ленінскай генеральнай лініі партыі.

У адказ на прамову тав. **СТАЛІНА** рабочыя і ІТР завода «Чырвоны барацьбіт» узялі на сябе рад абавязацельстваў па рамонту трактароў і выпрабу запасных частак:

рамонт скончыць 5 сакавіка замест 15-га;

выканаць план па выпрабу запасных частак па трактароў не пазней 25 лютага, г. зн. на 16 дзён раней тэрміну;

упянць якасць прадукцыі, знізіць брак;

да 15-га лютага перавесці прапрацоўку да кожнага рабочага.

У АДКАЗ НА ДАКЛАД тав. СТАЛІНА

Рабочыя пашывачнага цэха і індывідуальных заказаў фабрыкі 8-га сакавіка з вялікім энтузіязмам сустрэлі даклад правадыра сусветнага пролетарыята тав. **Сталіна.**

Стары рабочы тав. **Шыла** ў словах: «Палепшыць якасць выпускаемых тавараў, спыніць выпуск некамплектнай прадукцыі і карацць усіх тых таварышоў, не гледзячы на асобы, якія парушаюць і абыходзяць законы совецкай улады аб якасці і камплектнасці прадукцыі», — вельмі чула адчуў, што і яму трэба палепшыць якасць прадукцыі. Плане, пашытае па індывідуальнаму заказу, ва ўсіх адносінах павінна быць лепшым за стандартныя рэчы масавага вырабу.

— Словы тав. **Сталіна** аб заможным жыцці рабочых абавязваюць мяне, як старога рабочага, — кажа тав. Шыла,—яшчэ больш прадукцыйна працаваць, каб ускладзеныя абавязкі па якасці і колькасці выканаць з поспехам. Знаходзячыся на рубяжы двух светаў, даю абяцанне здаць ваенную справу на значок лепшага варашылаўскага стралка, каб у выпадку нападу на нашу краіну ворагаў рабочага класа нанесці ім **«сакрушальны адпор, каб у далейшым непавадна было ім совець сваё свіное рыла ў наш совецкі агарод».**

Я.

ЛЕПШ ПРАЦАВАЦЬ ЧЫМ РАНЕЙ

На фабрыцы «Комунарка» адбыўся мітынг рабочых, прысвечаны адкрыццю XVII з'езда ВКП(б) і дакладу тав. **Сталіна** на з'ездзе.

Сакратар партыйнага калектыва фабрыкі «Комунарка» тав. **Гольдзін** пазнаёміў аб зместе даклада тав. Сталіна. З вялікай увагай выслухалі рабочыя паведамленне аб дакладзе свайго любімага кіраўніка і сталёзага рулявога сусветнай пролетарскай рэволюцыі.

Рабочы шакаладнага цэха тав. **Герасіменка** сказаў:

— Кожны з нас на сённяшнім мітынгу павінен узяць на сябе как крэпкае самаабавязацельства па выкананню промфінплана, дабіцца выпуску высокакласнай прадукцыі, узняць прадукцыйнасць працы, дабіцца зніжэння сабекошту на **21** проц. і павялічэння вырабу прадукцыі. Упарта змагацца за ажыццяўленне дырэктыў нашай партыі аб харчовай прамысловасці — гэта лепшы адказ на даклад нашага любімага тав. **Сталіна.**

Рабочыя «Комунаркі» пастанавілі прапрацаваць даклад тав. Сталіна і ўсе матэрыялы з'езда ва ўсіх цэхах, брыгадах і зменах.

Гучнымі апладысментамі і крыкамі: «Няхай жыве наш Сталін!» «Няхай жыве XVII з'езд ВКП(б)!» «Ура!»—віталі рабочыя гістарычны з'езд большэвіцкай партыі і любімага правадыра і друга тав. Сталіна.

АФАНАСЕНКА.

Прадаўжаем барацьбу з новымі сіламі

Вялікая зала клуба менскай чырвонасцяжнай фабрыкі **«Окцябр»** упрыгожана баявымі лозунгамі, партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада. Не толькі ў клубе, а і ў цэхах фабрыкі адчуваецца вялікае свята. На фабрыцы новы ўздым энтузіязма рабочых і работніц.

Роўна ў **3** гадзіны дня—гудок і ў прасторную залу клуба з усіх цэхаў фабрыкі палянклі калоны рабочых і работніц. Радасны гомін і смех больш **1000** чырвонасцяжных пашыўшчыкаў нарушыў цішыню светлай і прыгожай залы.

Ля трыбуны сакратар парткома, які аб'явіў мітынг, прысвечаны **XVII з'езду ВКП(б) і дакладу тав. Сталіна, адкрытым.** Імя тав. **Сталіна** спаткана апладысментамі і крыкамі **«ура! Няхай жыве наш любімы Сталін! Няхай жыве Ленінскі XVII з'езд ВКП(б)!»**

Кароткі і ясны інфармацыйны даклад тав. **Фішбейна** аб працы XVII з'езда і дакладзе тав. Сталіна выслухоўваецца перапоўненай залай з напружанай увагай. Вытрымкі з даклада тав. **Сталіна** і яго імя сцішне дакладчыка новай бурай апладысментаў.

Да трыбуны са спягам падыходзіць дэлегацыя завода **«Ударнік».** Старшыня дэлегацыі тав. **Капылаў** у адзнаку XVII з'езда кітае тав. **Сталіна** і рапортуе XVII з'езду **ВКП(б) аб выкананні на 28 студзеня студзеньскага промфінплана на 100,3 %.** Дэлегацыя завода «Ударнік» выклікае чырвонасцяжную фабрыку **«Окцябр»** на соцспаборніцтва па датэрміновому выкананню кольвасных і якасных паказальнікаў промфінплана першага квартала. Зачытваецца соцумова з рядам канкрэтных самаабавязацельстваў.

Ударнікі фабрыкі **«Окцябр»**, прымаючы выклік, рапартавалі **XVII з'езду ВКП(б) аб выкананні імі на 28 студзеня студзеньскага промфінплана на 113 проц.**

Для заключэння і падпісання соцумовы ў гонар XVII з'езда ВКП(б) ад фабрыкі «Окцябр» пасылаецца дэлегацыя ў складзе **7** асоб на завод «Ударнік».

«Няхай жыве першы ўдарнік і любімы кіраўнік працоўных усяго свету—наш Сталін! Ура. Громкія апладысменты і лозунгі дакесліся далёка ў цэхі.

А. МАРОЗ.

Нашы самаабавязацельствы

Чырвонасцяжны завод **«Большэвік»** кітае прапанову ўдарнікаў перадавых фабрык і заводаў Гомеля і ўключаецца ва ўсебеларускую перакліку па выкананню плана другога года другой большэвіцкай пяцігодкі.

У час прапрацоўкі даклада тав. **Сталіна** на XVII з'ездзе партыі рабочым калектывам завода ўзяты наступныя самаабавязацельствы:

Перавыканаць тэхпромфінплан 1934 года па ўсіх паказальніках, выканаць поўнасцю план выробу экспарта і ліквідаваць прарыў па зніжэнню сабекошту. Прапрацаваць план у брыгадах, давёўшы яго да кожнага паасобнага рабочага:

шляхам большэвіцкага разгортвання юстаўскага руху дабіцца ахопу ім мацсімальнай колькасці ўдарнікаў;

скласць заводскую партыйную тэхнічную канферэнцыю, на якой падвесці вынікі тэхвучобы 1933 года і вызначыць далейшыя задачы па аўладанню тэхнікай, правёўшы к 1 мая другі соцтэхэкзамен па заводу;

па прапраўку 1934 года падрыхтаваць не менш 200 варашылаўскіх стралкоў.

Па выкананню гэтых самаабавязацельстваў спаборнічаем з заводам імя Варашылава. Лист ударнікаў перадавых гомельскіх прадпрыемстваў прапрацоўваем ва ўсіх брыгадах.

Сакратар партколектыва ГЕЛЕР.

Дырэктар БАНДАРЧЫК.

Старшыня заўкома ПІРАЦІНСКІ.

УЗМОЦНІМ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЦЬ КРАІНЫ

Рабочыя комунараўцы з вялікім захапленнем і энтузіязмам чытаюць даклад правадыра партыі пролетарыята.

Пад яркім святлом электрычнай лямпачкі ў кватэры Збушынскага сабралася каля 20 рабочых з сваімі жонкамі і дзецьмі.

Поўная цішыня панае ў пакоях. Кожны ўважліва сочыць за словамі вялікага правадыра, у якіх — наша будучыня, радаснае жыццё працоўных СССР.

У час прапрацоўкі, пасля кожнай гадзіны работы адсяцідзвілінны перапынак, у час якога расцвітаўся вясёлы смех, звонкія песні. Рабочы Захаравіч расцягваў цвухрадную гармоніку і падпяваў: «Нам прислала Москва подкрепление, мы всем фронтом пошли в наступление».

Пасля прапрацоўкі даклада гаварылі рабочыя-ветэраны завода. Тав. Равінскі ў адказ на словы тав. Сталіна аб пагрозе вайны супроць Совецкага Саюза абавязаўся да 5 лютага стаць варашылаўскім стралком.

— Для лепшага замацавання пасягнутых намі поспехаў у першай пяцігодцы бяру на сябе абавязацельства здаць тэхэкзамен на «добра» і «вельмі добра» і ў месяцу — кажа другі рабочы Шорац.

— Бяру на сябе задачу пастаўніць працу лучэйшай. Адзін кавальскага цэха так, каб была першай на заводзе «Комунар»—дадае стары рабочы Захаравіч.

Абгаварэнне прамовы тав. Сталіна прадаўжалася і далей. Яго словы аб заможным жыцці яшчэ больш падняслі актыўнасць рабочых. За шклянкай гарбаты рабочы Збушынскі апавядаў пра сваё мінулае жыццё да Окцябра.

«Раней я працаваў у саматужных кавальскіх майстэрнях, зараблеў вельмі мала. Часта былі такія моманты, калі не было за што купіць кавалак хлеба. Цяпер, калі тав. Сталін гаворыць аб заможным жыцці, то мне здаецца, што яно ў мяне ўжо наступіла. Я сам зарабляю **200** руб., сыны мае, дзякуючы Совецкай уладзе і партыі, атрымалі вельмі добрае выхаванне, якога я і ў вясне ніколі не спіў. Старшы мой сын **Антон** працуе механікам, зарабляе ў месяц **350** руб., меншы сын Іосіф—шофер, атрымлівае **200** руб., жонка старшага сына атрымлівае **250** руб. і увесь мой бюджэт у месяц складае 1025 руб.

Так гаварыў Збушынскага закончыўся гонар прапрацоўкі даклада тав. Сталіна.

ЯСТРЭМСКІ.

УСЕБЕЛАРУСКАЙ ПРАВЕРКАЙ ГАТОЎНАСЦІ ДА СЯЎБЫ— АДКАЖАМ НА ДАКЛАД ПРАВАДЫРА

Адказ калгаснікаў с.-г. арцеляў „Новае жыццё“ і „Першы май“, Слуцка а раёна, на даклад тав. Сталіна

Толькі што мы прачыталі справаздачны даклад тав. **СТАЛІНА** на XVII з'ездзе ВКП(б). У адказ на гэта пісьмовае выступленне правадыра партыі і сусветнага пролетарыята мы хочам падзяліцца вопытам, расказаць аб праведзеным намі рэйдзе-праверцы гатоўнасці калгаснікаў да веснавой сяўбы. Нам здаецца, што вопыт нашых калгасаў варты таго, каб папулярызаваць яго і пашырыць у іншых калгасах БССР.

Напярэдадні адкрыцця XVII з'езда ВКП(б) палітаддзел нашай МТС правёў масавы рэйд праверкі гатоўнасці калгасаў да вясны. Больш 200 лепшых калгаснікаў-ударнікаў, аб'яднаных ў 22 брыгады, выехалі па калгасах і на месцы правяралі захаванасць насенных і страхавых фондаў, ход рамонту і якасць адрамантаванага інвентара, становішча конскага парку, ход вывазкі навозу і т. д.

У рэйд уключыліся і калгасы, якія не ўваходзяць у зону МТС («Авангард», «Чырвоная Вясея»). Рэйд ператварыўся ў сапраўдны паход калгасных мас за хутчэйшую і добраякасную падрыхтоўку да сяўбы, за зніжэнне ўсіх недахопаў і недахопаў у калгасах. Рэйдавыя брыгады, прыязджаючы ў калгасы, не займаліся толькі фіксацыяй недахопаў, а на месцы арганізоўвалі калгаснікаў на неадкладнае іх знішчэнне.

Брыгада нашага калгаса «Першы май» выявіла ў калгасе «Пражэктар», што ён зусім не рыхтаваўся да вясны: не былі засыпаны насенфонды, не прыступілі да рамонту інвентара, свінарнікі і стайні не былі апеклены. Вінаватым за ўсё гэтай бесгаспадарчасці з'яўляўся старшыня калгаса, п'яніца **Скрыпка.**

Па ініцыятыве брыгады Скрыпка быў знят з пасады старшыні.

Старшынёй калгаса «Пражэктар» па ініцыятыве брыгады абраны наш лепшы калгаснік ударнік Ермакоў Іосіф. Пасля гэтага падрыхтоўка да сяўбы разгарнулася. За некалькі дзён там скончана ссыпка насення, размяркована ўраджай, разгорнут рамонт інвентара, апеклены свінарнікі і стайні. Калгаснік-ударнік Ермакоў паказаў сапраўдны ўзор, як трэба працаваць, як трэба рыхтавацца да вясны.

Рэйд з'явіўся лепшым сродкам перапісвання дасягненняў перадавых калгасаў у адстаючыя. Рэйдавыя брыгады не абмяжоўваліся толькі праверкай, яны прымацавалася да адстаючых калгасаў, і абавязаліся вывесці іх у перадавыя.

У гэтым сіла нашага пачынання.

У адстаючым калгасе «Новы свет» нашай рэйдавай брыгадзе з калгаса «Новае жыццё» не верылі, што мы ўжо гатовы да вясны і можам выйсці ў поле і пачаць сяўбу. Між тым гэта так.

Да вясны мы пачалі рыхтавацца яшчэ з восені. Увесь інвентар мы адрамантавалі больш двух месяцаў таму назад. Але мала яшчэ адрамантаваць, мы яго прывялі ў баявы парадак. Усе бораны ў нас пастаўлены ў асобным гаражы, змазаны. Да кожнага звяна боран ёсць стальвага, вальзі і пастромкі. Тое самае і з плугамі. На кожным плузе і бароне пастаўлен нумар. Кожны калгаснік у брыгадзе ведае нумар свайго плуга і боран. Апрача асноўных плугоў ёсць яшчэ розерв на выпадак паломак пры рабоце. Калёсы таксама стаяць адрамантаванымі ў гаражы.

Коні замацаваны за поўнымі гаспадарамі, збруя ўся адрамантавана. У нас не знойдзеш ні аднаго хамута без набедрыкаў.

Але гэта толькі адна выкананая намі задача. Калі-б мы не выканалі другой — мы лічым, самай рашаючай і важнай задачы — гроші цана была-б нашай рабоце.

Другая задача — гэта барацьба за павышэнне ўраджайнасці нашых палёў у 1934 г.

Што мы для гэтага зрабілі?

Па-першае, мы зрабілі і робім усё неабходнае для правядзення звышрэнняй і ранняй сяўбы. Па санай дарозе мы ўжо вывезлі ў поле, склалі ў штабелі на 50 га гною, торфу, штучнага ўгнаення. Штабелі склалі ў чуснья, па ўсіх правілах агратэхнікі. На зямлі кладзем тонкі пласт торфу, потым наверх пласт гною і на гной засыпаем штучнае ўгнаенне. На вер се кожнага штабеля робім шчыт з дробнага торфу, каб не мог уцячы аміяк.

Мы рэгулярна збіраем попел. Кожную суботу падвода аб'язджае двары калгаснікаў, збірае попел і звозіць яго ў адно месца. Ужо сабрана больш 5 тон попелу.

Не будзем гаварыць пра насенне, якое мы рэгулярна правяраем, пра забраніраваны фонд канцэнтраваных кармоў і добраякаснага сена на час сяўбы для коней. Напомнім толькі, што ў нас пісьмо ры актыўна змагаюцца за павышэнне ўраджайнасці. Яны арганізавалі пастаянае шэфства над стайнямі, свінарнямі з насеннем, гаражом і інвентаром. Піонеры ператвараюць гаспадынь, як яны збіраюць попел.

Усе падрыхтоўчая работа да вясны праходзіць па брыгадах. Брыгады, спаборнічаючы паміж сабой на лепшую падрыхтоўку, не аслаблі, а ўмацаваліся і арганізаваліся і набытымі ведамі. Брыгадзіры прайшлі спецыяльныя курсы, асноўны каснік калгасаў прапускаем праз гурткі агра і зоатэх ніку.

У 1933 годзе ўраджайнасць па вярнавых культурах склала ў час 12,2 цэнтн з га, супроць 1932 г. — рост у два разы. Па 1934 г. мы паставілі сабе задачу дабіцца ўраджайнасці па жыту, ячменю і пшаніцы не менш 15 цэнтн з га, па аўсу — 12 цэнтн. і па бульбе 160 цэнтн.

Пастаўленую задачу мы ажыццявім за што-б там ні стала. Ужо зараз мы вывезлі на поле каля 6 тысяч вазоў гною. Арганізавалі збор попелу.

Палітаддзел пашы калгасы «Новае жыццё» і «Першае мая», як перадавыя па МТС, запёс на чырвоную дошку. Мы помнім словы тав. **Сталіна,** што соцспаборніцтва дапамагае адстаючым дагнаць перадавых і дабіцца агульнага падёму. Мы перадаем свой багаты вопыт адстаючым калгасам, якія мы праверылі праз рэйд.

Мы прапануем, каб у адказ на прамову тав. **Сталіна** ўсе калгаснікі Совецкай Беларусі арганізавалі масавую соцправерку гатоўнасці калгасаў да вясны. Гэта самаправерка павінна стаць масавым пахотам за перанясенне вопыта перадавікоў у адстаючыя калгасы, каб дабіцца агульнага падёму і па першаму кліку вясны выйсці ў поле сеяць па ўтоенай зямлі, высокакласным адсартаваным насеннем, добра адрамантаваным інвентаром, на добрых конях і трактарах.

Хутчэй арганізуем гэту справу. Вясна ўжо на парозе і цяпер дората кожная гадзіна.

Па даручэнню калгаснікаў калгасаў «Новае жыццё» і «Першы май» падпісалі:

ГУРБО МІКІТА, ВАЙЦЯХОВІЧ ПЕТР, БЕРКОЎСКІ, ГУРБО ДУНЯ, ГУРБО ТАМАШ, ВАЙСТОВІЧ МАРЦІН, САСНОЎСКІ АЛЕСЬ, МАКАРАЎ ФАМА, ЕСІПОВІЧ ЯНКА, МУРАШКА ЛЕНЯ, КАЗЕЛ ВАСІЛЬ, КЛІЖЕЛЬ, СТРУГАЛЬ, КАЧУР, ВОЙЦІК, ТЫНКЕЛЕВІЧ, ГОРБІЗЭЙТ, КОРБ АРОН, МІКІЦІН, ГАПОНІН.

Быць гатовымі да вясны

ВІЦЕБСК (Па тэлефону).

У чырвоным кутку калгаса імя **ЧЫРВОНАЙ АРМІІ** поўна народу.

Калгаснікі з усіх вытворчых брыгад сабраліся на сход, прысвечаны адкрыццю XVII з'езда ВКП(б) і дакладу тав. **СТАЛІНА.** Даклад тав. Сталіна быў прослуханы на сходзе з вялікай увагай, пасля чаго разгарнуліся гарачыя спрэчкі.

Першым узяў слова калгасны каваль т. **Кулікаў.**

— Тав. Сталін адчуў шмат увагі нашаму калгаснаму жыццю. Вось чаму мы, — гаворыць Кулікаў, — у адказ тав. Сталіну павінны як мага лепш сустрэць веснавую сяўбу.

Я хачу падрыхтавацца, як мы, кавалі, выконваем свае абавязацельствы. Да XVII партз'езда мы абавязаліся адрамантаваць сельскагаспадарчы інвентар. Фактычна-ж мы поўнасцю адрамантавалі плугі, бораны, сявалкі і іншы інвентар да 18 студзеня. 75 проц. калёс таксама адрамантаваны.

Старшыня калгаса тав. **Паўлоўскі** ў сваім выступленні спынуўся на выкананні абавязацельстваў па засыпцы насенных фондаў. Насенне ў гэтым годзе ў нас у добрым стане. Неабходна толькі яшчэ раз прапусціць праз трыер ячмень. Усё насенне праверана на ўсхожасць. Насенне аўса мае 99,5 проц. ўсхожасці, насенне вікі—99 проц., ячменю—98,5 проц. і гародніны — 100 проц. ўсхожасці.

Летась — гаворыць Паўлоўскі —у нас быў вялікі тормаз з закладкай парнікоў. Гною мы навазілі многа, а скарыстаць яго як след не маглі. Сёлета мы гэтым фактыў лічылі. У нас ужо зараз ёсць 620 закладзеных і заселаных парнікоў.

Конюх **Жураўскі** спыняецца на становішчы цягавай сілы і выказанні сваіх абавязацельстваў па падрыхтоўцы коней да вясны. Летась у радзе брыгад коней пагінулі кулакі, у розультаце са 119 коней на веснавых работах працавала по больш 21. Сёлета гэтага не моха быць. Догляд коней даручан лепшым калгаснікам-ударнікам, коні добра чысцяцца і даглядаюцца, але ўсё-ж яны толькі сярэдняй сытасці і патрабуюць яшчэ лепшага догляду.

Сакратар партыйнай ячэйкі калгаса т. **Эльберт,** падкрэсліваючы спрэчкі, падкрэсліў, што на дасягненнях, як адзначыў у сваім дакладзе т. Сталін, супакойвацца нельга.

Калгаснікі сельска-гаспадарчай арцелі «Чырвоная армія» у даклад па даклад т. **Сталіна** пастанавілі намачы ўсе сілы, каб поўнасцю захаваць увесь прыплод ад ацёлаў і апаросаў 1934 г., каб рэалізаваць усе ўказанні т. **Сталіна**—зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а ўсіх калгаснікаў заможнымі.

А. ЗАРУБЕЖНЫ, СІПКО.

Да скančэння XVII партз'езда адрамантаваць прычэпны інвентар

ГОМЕЛЬ 27 (па тэлефону).

Летась МТС скончыла рамонт трактароў 18 сакавіка. Сёлета такія тэмпы не маглі задаволіць ні палітаддзел, ні рабочы калектыў МТС. У гонар XVII з'езда ВКП(б) рабочыя МТС абавязаліся закончыць рамонт усіх 18 трактароў на месяц раней тэрміну, намечанага Трактарацэнтрам. Гэта сваё слова рабочыя МТС стрымалі.

У дзень адкрыцця XVII з'езда партыі рабочыя направілі апошні 18-ы трактар, які вытрымаў праверку, як і ўсе раней адрамантаваныя трактары. Асабліва вызначылася брыгада тав. **ЦОЧАВА,** якая, уключыўшыся ў вытворчы паход імя XVII партз'езда, паклала шмат энергіі на выкананне свайго задання па рамонту 8-мі трактароў.

Не бывала такога выпадку, каб брыгада Цопава прастойвала без работы. Калі здараліся перабоі з запаснымі часткамі, тав. Цопаў са сваёй брыгадай самі на цэлыя дні станавіліся ля варштатаў у МТМ, каб вырабіць патрэбныя часткі. Поспех быў забяспечан тым, што брыгады МТС не чакалі, пакуль ім дадуць дэталі або запасныя часткі, а самі непасрэдна іх рабілі. Ужо 19 студзеня брыгада Цопава дала свае 8 трактароў, пераключыўшыся на дапамогу астатнім брыгадам.

Спаборнічаючыя з тав. Цопавым брыгады т. т. Стасевіча і Літвіновіча былі вымушаны падцягвацца і ліквідаваць сваё адставанне.

Вялікая работа, праробленая па літаддзелам па разгортванню соцспаборніцтва, з'явілася той сілай, якая разбіла ўсе перашкоды, прывяла МТС да перамогі.

На лятучым мітынгу, прысвечаным адкрыццю XVII партз'езда, рабочыя МТС абавязаліся яшчэ больш разгарнуць соцспаборніцтва і закончыць рамонт усяго прычэпнага інвентару да скančэння работ XVII з'езда ВКП(б).

Рабочыя МТМ стварылі 2 брыгады імя XVII з'езда ВКП(б) і абавязаліся пры дапамозе буксірнай брыгады рабочых МТС выканаць праграму рамонту да 16 лютага.

НОВАЯ БЛІСКУЧАЯ ПЕРАМОГА СОВЕЦКАЙ НАВУКІ І ТЭХНІКІ

Экіпаж падняўшагася ўчора 2-га совецкага стратастата „Асоавіяхім“ шле з вышыні 20.600 метраў палкае прывітанне 17 з'езду і любімаму правадыру тав. СТАЛІНУ

НОЧ ПЕРАД СТАРТАМ

Густыя воблакі закрылі неба. Ад палёў каля Кунцава, дзе ў гэту ноч сабраліся ўдзельнікі і арганізатары палёту, яны праспіраліся на поўдзень—к Туле, на поўнач—к Чарэпаўцу, на захад—к Вязьме. Ледзь улавімы вецер цягнуў па ўсход—кудысці на Арзамас.

Ішла першая гадзіна. Як і ў тую памятную ноч на 30-е верасня 1933 года, калі рыхтаваўся к падёму стратастат «СССР», рабіла апошняя генеральная праверка ДРУГОГА совецкага стратастата —«СОАХ-1».

...Каманд зір стратастата ФЕДАСЕЕНКА, інжынер ВАСЕНКА і малады вучоны ЎСЫСКІН коратка дакладваюць аб гатоўнасці стратастата.

Праверана ўсё да драбнейшых дэталяў: прыборы, вага паасобных частак апарата, колькасць газа, харчы экіпажа.

— Баласт?

— Прадугледжана,—адказвае Федасеенка,—калі не хопіць баласту пры пасадцы, будзем выкідваць другарадныя дэталі. Калі і гэтага акажацца недастаткова,—выкінемся самі па парашутах.

— У якім парадку? — пытаў тав. Алексіс.

— Першым тав. Усыскін, за ім Васенка. Апошнім—я...

— Прыборы захаваем усе.

На стале перад старшынёй Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма тав. ЭЙДЭМАНАМ і начальнікам ваенна паветраных сіл СССР тав. АЛКСНІСАМ ляжала разгорнутая карта надвор'я.

— Што можна чакаць на світанні?..

...У 1 гадзіну 10 мінут ночы тав. Эйдэман даў распараджэнне рыхтавацца да старта. Каманда пад начальствам тав. Дзмітрава стала ля газгольдэраў.

Федасеенка, Васенка і Ўсыскін пайшлі на адпачынак. Да світання.

— Шчаслівых сноў і вялікай вышыні—пажадаў стратанаўтам начальнік ваенна-паветраных сіл.

СВІТАННЕ

Па снягу цягнуўся гіганцкі пажыўны шланг. Абалонка хутка напаўнялася вадародам. Стратастат прымаў форму непрадпадобнага іспалінскага грыба.

Чалавек у валёнках, падняўшыся на юркім шары-скакуне, апчуваў цела стратастата, «выслухоўваў» пазы і швы. Частка каманды мацавала антымагнітную хрома-нікелевую гандолу, запаўняючы яе прыборамі, інструментамі, цёплым адзеннем і прадуктамі.

З паветранай разведкі вярнуўся самалёт «У-2», які далажыў камандаванню аб спрыяючых метэаралагічных умовах. Туманы адно сіла за Серпухоў, вільготнасць ака залася нізкай, вецер—нязначным.

Пералёваючыся і булькаючы, у абалонку ішла 26 сотня кубаметраў газа. Стратастат выцягнуўся над зямлёй, прыняўшы форму групы.

З боку на стропах качаліся аўта матычныя метэарографы і барографы. Пачалося крапатлівае прымацаванне гандолы.

Праз яе малюпасенькія вокны відаць лабараторнае ўзбраенне палёту: спецыяльна зробленыя для пад'ёму ў стратасферу барометры і высотныя альтыметры, прыборы для вывучэння касмічных праменняў і ўзяцця проб паветра, для аэрафотаздымкаў, радыёапаратура і многае, многае іншае.

АДДАН ЗАГАД ПАКІНУЦЬ ЗЯМЛЮ

У 8 гадз. 20 мінут на стартавым полі паказаліся тт. Федасеенка, Васенка і Ўсыскін, апранутыя ў зімовыя электрыфікаваныя камбінезоны.

Праверыўшы гатоўнасць стартавай каманды, тав. Эйдэман падпісвае загад камандзіру стратастата ПАКІНУЦЬ ЗЯМЛЮ Ў 9 ГАДЗІН РАНІЦЫ.

Тав. Ільін перадае экіпажу сцяг Асоавіяхіма.

— Гэты сцяг вы павінны з гонарам данесці да «паталка».

Лётнае поле замерла.

— Ад імя экіпажа «Асоавіяхіма»,—гаворыць тав. Федасеенка,—у дні гістарычных пасяджэнняў 17 партз'езда я запэўняю, што мы гатовы ўзняць штурмам вышыні стратасферы, недасягаемыя да гэтага часу. 36 навуковых прыбораў карабля знаходзяцца ў поўнай спраўнасці. Стратастат «СССР—СОАХ-1» к пад'ёму ў стратасферу гатоў.

Апошнія падрыхтаванні.

Экіпаж, у гандолу, — раздаецца каманда начальніка старта.

Удзельнікі палёту хутка паліскаюць працягнутыя ім рукі і ўзбіраюцца па гандолу к верхняму люку.

ДА АДЛЁТУ—2 МІНУТЫ. Праф. МАЛЧАНАЎ напамінае тав. Васенка, што ўсе прыборы павінны вярнуцца на зямлю ў ПОЎНАЙ ЗАХАВАНАСЦІ, ЗАПЯЧАТАНЫМІ З ПЛОМБАМІ. Тав. Алексіс зноў пытае—ці праверены парашуты на выпадак вымушанай высадкі экіпажа з гандолы.

— Праверены.

СТРАТАСТАТ ЗНІК У ВОБЛАКАХ

—Зважа-а-ай! — нясецца полем каманда начальніка старта.—Адпусціць паясныя. Адпусць гандолу.

9 гадзін 07 мінут.

— У палё-ё-ё-т.

— Ёсць — стратастат у палёце.

Хутка змяншаючыся, стратастат «Асоавіяхім» адыходзіў у першы ў свеце ЗІМОВЫ палёт у стратасферу.

З срабрыстай гандолы паказалі галовы адважных большэвікоў.

Складзены рукі рупарам, Федасеенка крыкнуў:

— Няхай жыве 17 з'езд партыі!

— Няхай жыве сусветная рэвалюцыя!

Шматгалосае «ура-а-а» пранеслася па полі.

Праз дзве мінуты стратастат знік у воблаках.

У 2 гадзіны 15 мінут дні на з'ездзе тав. ПОСТАНЭВЫМ была агалошана наступная радыёграма:

«17 з'езд партыі.

Перадайце палкае прывітанне вялікаму гістарычнаму 17 з'езду ВКП(б).

Вялікаму і любімаму правадыру пролетарыята ўсяго свету тав. СТАЛІНУ.

Т. т. МОЛАТАВУ, КАГАНОВІЧУ і ВАРАШЫЛАВУ, з вышыні 20.600 метраў.

ЭКІПАЖ СТРАТАСТАТА «СОАХ-І».

ГАВОРЫЦЬ „СІРЫУС“

9 гадз. 16 мінут. — Слухайце, слухайце. Гаворыць «СІРЫУС», *) гаворыць «СІРЫУС». 1.600 метраў. Прайшлі воблакі. Тэмпература — мінус 3. Пераходжу на прыём.

9 ГАДЗ. 23 МІНУТЫ. — Алло, алло. «Сірыус», «Сірыус». — Гаворыць «ЗЯМЛЯ». Вашу радыёграму прынялі. Чуваць вельмі добра. Перадавайце пачалыней.

9 ГАДЗІН 32 МІНУТЫ. — Гаворыць «СІРЫУС» на хвалі 69 метраў.

Вышыня — 6.000 метраў па альтыметру. Тэмпература на вышыні 3.000 метраў — мінус 22. Настрой экіпажа бадзёры. У акно гандолы свеціць сонца. Пачынаем браць пробы паветра.

9 ГАДЗІН 56 МІНУТ. — Гаворыць «СІРЫУС». Вышыня — 15.000 метраў па альтыметру. Тэмпература — мінус 15. У гандоле тэмпература — 0. Узяты тры пробы паветра. Увізе — густая воблачнасць. Выхлапчыць кірунак палёту немагчыма. Вядзем назіранне па шкале Томсона. Перадачы з сямлі не чуваць.

10 ГАДЗ. 40 МІНУТ. — Гаворыць «СІРЫУС». Вышыня — 19.000 метраў. Ціск па барометру — 49 мм. Знаходзімся ціск перадаў (мабыць раней). Знаходзімся тэмпература — мінус 42. Настрой бадзёры. Прывітанне з вышыні ў 19.000 метраў ЦК партыі на чале з тав. СТАЛІНЫМ. Прывітанне Цэнтральнаму Совету Асоавіяхіма. Баласту не скарысталі ні кілаграма. Тэмпература ў гандоле плюс 1,2. Бяром пробу паветра.

Ля мікрафона—камандзір стратастата «Асоавіяхім» ФЕДАСЕЕНКА.

— ШТУРМУЕМ ВЫШЫНІ ДВАЦЦАТАГА КІЛОМЕТРА. Прывітанне газетам «ПРАВДА» і ИЗВЕСТИЯ». Прывітанне ленінградскаму пролетарыяту, пабудаваўшаму ган долу стратастата.

10 ГАДЗ. 15 МІНУТ. — Гаворыць «ЗЯМЛЯ». Горача вітаем геройчны экіпаж стратастата «Асоавіяхім». Найлепшыя пажаданні ўдарнікам стратасферы. Вашу радыёграму аб дасягненні вышыні 19.000 метраў прынялі. Чуваць вельмі добра.

Перадаем радыёграму: «Гарачае прывітанне гераічнаму экіпажу стратастата Асоавіяхім». Шлем найлепшыя пажаданні. Рэдакцыя «ПРАВДЫ».

10 ГАДЗІН 24 МІНУТЫ. — Алло, алло... (пропуск. Чутнасць стратастата пратала).

10 ГАДЗІН 33 МІНУТЫ. — Гаворыць «ЗЯМЛЯ». Адказвайце, як нас чуваць. Перадавайце павальней.

10 ГАДЗІН 45 МІНУТ. — Гаворыць «ЗЯМЛЯ». У масках патроны «Аўдос» не выкручаны кроплі. Для прыёму ўключайце апошнюю батарэю. Перадаем радыёграму: Ад імя байцоў і камандзіраў Чырвонай арміі прывітанне і чырвонаармейскаю «ура» ўдарнікам стратасферы. «КРАСНАЯ ЗВЕЗДА».

10 ГАДЗІН 54 МІНУТЫ. — Гаворыць «ЗЯМЛЯ». Перадаю радыёграму: «Горача вітаем байцоў Асоавіяхіма, штурмуючых стратасферу. Упэўнены, што ваш палёт узбагаціў новымі дасягненнямі совецкую навуку і тэхніку. ЭЙДЭМАН, АЛКСНІС, ІЛЬІН, ПРАКОФ'ЕЎ».

11 ГАДЗІН 16 МІНУТ. Гаворыць «СІРЫУС» — паведамляем, апошнія цыфры.

Тэмпература знаходзнага паветра — мінус 38, у гандоле — плюс 15. Вышыня па альтыметру — 20.500 метраў... (канец не прыняты).

11 ГАДЗІН 27 МІНУТ. — Гаворыць «ЗЯМЛЯ». Вашу радыёграму прынялі цяпоўнасцю. Перадавайце раздзельней.

11 ГАДЗІН 42 МІНУТЫ. Гаворыць «СІРЫУС». Вышыня 20.600 метраў. Слухайце, слухайце. Перадаем радыёграму 17 з'езду партыі...

11 ГАДЗІН 49 МІНУТ. Я — «ЗЯМЛЯ». Вашу радыёграму аб штурме дваццаць першага кілометра прынялі. Перадаем радыёграму:

«Вітаем з бліскучым пад'ёмам у цяжкіх зімовых умовах. Упэўнены ў атрыманні вамі новых даных аб складзе паветра, інтэнсіўнасці касмічных праменняў і антычных уласцівасцяй атмасферы на недасягнутых да гэтага часу вышынях. Совецкая навука і тэхніка ганарацца вашымі поспехамі, якія маюць сусветнае значэнне.

Камісія па вызначэнню вышыні—прафесары МАЛЧАНАЎ, ТЭРОГАНЕСАЎ, ТУБОМСКІ, ВЕРЫГА, КУЛАКОЎ».

11 ГАДЗІН 59 МІНУТ. — Гаворыць «СІРЫУС». Радыёграму прынялі, чутнасць вельмі добрая. Перадаем апошнія назіранні. Мікрабарометр — 36, барометр — 45. ПАЧЫНАЕМ ЛСЦІ ЎПІЗ. Тэмпература ў гандоле—плюс 20. Вышыня па альтыметру — 20.500 метраў. Робім бесперапынныя назіранні і вопыты (пропуск) для вывучэння касмічных праменняў. Алло. Каманда стратастата «Асоавіяхім» перадае гарачае прывітанне ленінскаму комсамолу і яго штабу — Цэнтральнаму Камітэту на чале з тав. КОСАРЭВЫМ.

Алло. Гаворыць «СІРЫУС». Прывітанне баявому цэнтральнаму органу нашай партыі — газеце «ПРАВДА»... Часова спыняем прыём і перадачу для таго, каб уключыць патроны для паглынання вуглекіслаты. Чакаем паведамлення аб прыёме нашай радыёграмы.

12 ГАДЗІН 25 МІНУТ.—Я—«ЗЯМЛЯ». Перадаю радыёграму. «Камандзіру стратастата т. ФЕДАСЕЕНКА. Давайце часцей радыё, каб мець магчымасць пеленгіраваць і вызначыць дакладнае месца вашай пасадкі. АЛКСНІС».

12 ГАДЗІН 36 МІНУТ.—Гаворыць «ЗЯМЛЯ».

«ВІТАЕМ гераічную каманду стратастата. Ганарымся вашымі поспехамі. Упэўнены ў такім-жа бліскучым спуску. Мільёны асоавіяхімаўцаў і Чырвоны паветраны флот вітаюць вас. АЛКСНІС, ЭЙДЭМАН».

12 ГАДЗІН 47 МІНУТ. — Я—«ЗЯМЛЯ». Пасля перапынку вас не чуем. Адказвайце. Перадаем радыёграму: «Экіпажу стратастата «Асоавіяхім». Палкае прывітанне героям стратасферы, высока ўзняўшым чырвоны сцяг нашай вялікай краіны.

Супрацоўнікі «Правды», «Известий» і «Комсомольской правды».

12 ГАДЗІН 51 МІНУТА. Я — «ЗЯМЛЯ». Усім назіральным пункам. Работу спыніць, геадэзістам сабрацца ў кіраўніцтве, радыстам вярнуцца к месцу пуску стратастата. НЕЧАЕЎ».

***

13 гадзін дня чутнасць радыё з стратастата спынілася. «Зямля» не раз выклікала «Сірыус», але ад казу не атрымала. Толькі каля 16 гадзін прыёмная радыёстанцыяй у Бутаве былі пачуты сігналы з радыёстанцыі стратастата, але на столькі неясныя, што ўстанавіць месцазнаходжанне стратастата ака залася немагчымым.

ГЕРОІ ДРУГОГА ПАЛЁТУ Ў СТРАТАСФЕРУ

ПАВЕЛ ФЁДАРАВІЧ ФЕДАСЕЕНКА

Тав. Федасеенка радзіўся ў 1898 годзе ў сям'і рабочага, у слабадзе Новая Сотня, Острагожскага павета, Варонежскай губерні. У 1918 г. рабочы мадэльшчык, Федасеенка добраахвотна ўступае ў рады Чырвонай арміі. Ён прымае ўдзел у баях супроць Петлюры, Дзенікіна, Врангеля... За баявыя заслугі ЎЗНАГАРОДЖАН ОРДЭНАМ ЧЫРВОНАГА СЦЯГУ, ЗБРОЯЙ, ЗАЛАТЫМ ГАДЗІННІКАМ.

Пачаўшы ў 1919 г. з камандных лётных курсаў, ён на працягу наступных гадоў скончыў курсы пілотаў-аэранаўтаў, курсы паветраных караблёў, вышэйшыя авіяцыйныя акадэмічныя курсы. У 1932 г. датэрмінова па першаму разраду скончыў ваенна-паветраную акадэмію імя Жукоўскага і факультэт дырыжаблебудаўніцтва камбіната грамадзянскага паветранага флота, атрымаўшы годнасць ІНЖЫНЕРА-КАНСТРУКТАРА ПА ДЫРЫЖАБЛЕБУДАЎНІЦТВУ.

Адначасова з вучобай тав. Федасеенка займаў камандныя пасады ў лётных часцях РСЧА, камандзіра лётнага атрада, камандзіра лётнага дывізіёна і інш.

9-ТЫ ЛЕТНЫ АТРАД, ЯКІМ КАМАНДАВАЎ ТАВ. ФЕДАСЕЕНКА ПАД ПЕРАКОПАМ, УЗНАГАРОДЖАН РЭВВАЕНСОВЕТАМ РЭСПУБЛІКІ ГАНАРОВЫМ РЭВОЛЮЦЫЙНЫМ ЧЫРВОНЫМ СЦЯГАМ.

З 1921 года тав. Федасеенка амаль кожны год прымае ўдзел у палётах і ставіць новыя рэкорды. У 1922 годзе ЁН ПАСТАВІЎ УСЕСАЮЗНЫ РЭКОРД ДАЎЖЫНІ І ВЫШЫНІ ПАЛЁТУ НА АЭРАСТАЦЕ (21 г. 40 мінут. і 5.000 метраў вышыні). У 1924 годзе атрымаў першы прыз па першых усесаюзных лётных спаборніцтвах. У 1925 годзе разам з прафесарам ФРЫДМАНАМ робіць палёт для доследаў высокіх пластоў атмасферы, прычым устанаўляе новы ўсесаюзны рэкорд — вышыню 7.460 метраў. Рэкордныя палёты на аэрастатах робіць ён і ў 1926, 1927, 1931 г. г.

У 1933 годзе дае новы СУСВЕТНЫ РЭКОРД НА ДАЎЖЫНЮ, а таксама новы ўсесаюзны рэкорд палёту на аэрастатах класа «А» НА ДАЎЖЫНЮ І ДАЛЬНАСЦЬ ПАЛЁТУ З ПАСАЖЫРАМ (43 гадз. 07 мінут).

Тав. Федасеенка ўвесь час вядзе вялікую арганізацыйную і навукова-даследчую работу ў Асоавіяхіме.

НАРАДЖЭННЕ СТРАТАСТАТА

Стратастат «СССР-СОАХ-1» пачаў будавацца па ініцыятыве ленінградскага Асоавіяхіма і пабудован на сродкі, сабраныя асоавіяхімаўскай грамадскасцю.

Праект стратастата быў распрацоўван групай спецыялістаў пад кіраўніцтвам інжынера Кірпічнікава і Васенка. У гэтай рабоце вялікі ўдзел прынялі навуковыя інжынерна-тэхнічныя таварыствы звар шчыкаў, металургаў, ленінградскі хіміка-тэхнічны інстытут, інстытут аэра-фота-здымкаў, фізіка-тэхнічны інстытут, радыёвы інстытут і ленінградскія заводы: імя Сталіна, Іжорскі, «Большэвік», «Красный выборжец», «Красный путиловец», «Промтехника», «Метприбор» і інш.

К канцу 1932 года праект асвоення стратасферы быў закончан і паднесен у гадавіну Окцябрскай рэволюцыі Цэнтральнаму Совету Асоавіяхіма. У студзені 1933 года ён быў прынят да ажыццяўлення і 1 лютага пачалася падрыхтоўка матэрыялаў для абалонкі, гандолы і прыбораў стратастата.

Для абалонкі гандолы ўпершыню была ўжыта самая тонкая ліставая немагнітная і неіржавеючая сталь таўшчынёю ў 0,6—0,8 м. м.

Вопыты па зварцы гэтых самых тонкіх лістоў сталі былі пастаўлены на 12 ленінградскіх водах. Усе работы па падрыхтоўцы матэрыялаў былі закончаны да 1 чэрвеня 1933 года.

Ленінградскія вучоныя (акадэмік ІОФФЕ, прафесары ВЕРЫГА, РЫЫІН, ЯНОЎСКІ, ОРБЕЛЛІ і інш.) вызначылі канструкцыі 34 складанейшых навуковых прыбораў для вывучэння стратасферы.

15 жніўня мінулага года будаўніцтва стратастата, выпрабаванні і падрыхтоўка да палёту былі скончаны, і спецыяльная камісія ўстанавіла поўную годнасць і гатоўнасць стратастата «Асоавіяхім» да палёту.

Аб'ём яго абалонкі, раўнасільны на паўтора трох чалавек і вялікай колькасці навуковых прыбораў — 25 тыс кбм (самаход 14 тыс. кбм. у Пскаве). Замест шоўку для абалонкі ўжыта бавоўна з водаплатнай тканіна — парусіна. Аб'ём гандолы 7 кбм.

„Сусветны рэкорд пабіт Совецкім Саюзам“

ВОДГУКІ АНГЛІЙСКАЙ ПРЭСЫ НА ПАЛЁТ

ЛОНДАН, 30 студзеня (Белта). Пад загалоўкам «Сусветны рэкорд пабіт Совецкім Саюзам» вядучыя газеты даюць падрабязныя паведамленні аб палёце ў стратасферу стратастата «Асоавіяхім» і выказваюць надзею, што новы палёт дасць падзвычайна каштоўныя навуковыя результаты. Газеты з асаблівай шкадаваннем адзначаюць, што ўдзельнікі палёту ўвесь час трымалі радыёсувязь з зямлёй.

СУСВЕТНЫ ДРУК АБ ДАКЛАДЗЕ тав. СТАЛІНА

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 30 студзеня (БЕЛТА). Не гледзячы на ўрадавы крызіс, які прыкоўвае да сябе ўсеагульную ўвагу, друк з асаблівай зацікаўленасцю прадаўжае сачыць за XVII з'ездам ВКП(б).

«Тан», змясціўшае ўчора шырокае паведамленне аб знешня-палітычнай частцы даклада Сталіна, сёння змяшчае паведамленне ТАСС, падаючы часткі даклада, прысвечаныя ўнутрыпалітычным праблемам СССР і праблемам другой пяцігодкі.

Газета публікуе тэлеграму свайго маскоўскага карэспандэнта, а таксама артыкул, прысвечаны аналізу рэзультатаў гаспадарчага будаўніцтва ў 1933 годзе і гаспадарчаму плану на 1934 год.

«Прамова Сталіна, — піша карэспандэнт, — заслугоўвае асаблівай увагі. Як вядома, генеральны сакратар партыі, не залішне часта выступае з прамовамі, — наадварот, ён скуп на аратарскія выступленні. Гэта надае асаблівую вагу яго заявам».

Адзначаўшы цвёрды тон заяў Сталіна па пытаннях знешняй палітыкі, карэспандэнт звяртае ўвагу на авацыі, якімі з'езд сустрэў даклад Сталіна.

Артыкул аб другой пяцігодцы падрабязна асвятляе гаспадарчыя дасягненні 1933 года, асабліва ў галіне прамысловасці.

«Калі совецкі ўрад гаворыць аб сваіх бясспрэчных перамогах на гаспадарчым фронце,—піша газета, — гутарка ідзе галоўным чынам аб новых прамысловых будоўлях».

«Энтрансіжан» адклікаецца на даклад Сталіна артыкулам, у якім піша:

«На 17 з'ездзе компартыі ў Маскве Сталін намаляваў мала аптымістычную карціну міжнароднага становішча. Аднак, трэба прызнаць, што яго ацэнкі ў цэлым правільны».

Газета прыводзіць многа цытат з даклада Сталіна, якія характарызуюць цвёрдую рашучасць СССР, прытрымліваючыся палітыкі ўмацавання міру, абараняць усю тэрыторыю ад якога-б там ні было нападу.

Гэтыя заявы газета супроцьставіць ваяўнічай заяве японскага ваеннага міністра Хаясі аб падрых тоўцы Японіі да вайны на Далёкім Усходзе.

«Энтрансіжан» піша:

«Вядома, што пры сучасным сусветным становішчы ні адзін кан флікт не можа быць лакалізаваным. Урады еўрапейскіх дзяржаў павінны пільна сачыць за развіццём падзей на Ціхім акіяне».

АНГЛІЯ

МАСКВА, 30 студзеня (БЕЛТА). Лонданскі ўласны карэспандэнт «Правды» паведамляе, што ўсе газеты публікуюць падрабязныя паведамленні аб прамове т. Сталіна на з'ездзе ВКП(б), адводзячы асноўную ўвагу пытанням знешняй палітыкі СССР.

Асабліва падрабязна прыводзяц па ўказанні т. Сталіна на характар адносін Совецкага Саюза з Англіяй, ПАЗШ, Японіяй, Германіяй, Польшчай. Некаторыя газеты завастраюць увагу на пытанні аб небяспецы новай сусветнай вайны.

«Манчэстар гардыян» перадае перасцярогу т. Сталіна аб ваеннай небяспецы наступным чынам:

«Будзе другая вайна супроць Совецкага Саюза, якая прыняце да поўнага шаражэння пакаляючых і змяце па многіх еўрапейскіх і азіяцкіх краінах буржуазныя і памешчыцкія ўрады гэтых краін. Гэта прадказана Сталіным у яго дакладзе на з'ездзе компартыі Совецкага Саюза».

Пресса адзначае заяву т. Сталіна аб значэнні ўстанаўлення дыпламатычных адносін з ПАЗШ і по бач з гэтым яго ўказанне на нездавальняючасць англа-совецкіх адносін і на антысовецкія настроі ў радах кансерватыўнай партыі.

Пры гэтым словы т. Сталіна ацэньваюцца наступным чынам: «Некаторыя брытанскія кансерватары не могуць жыць без наскокаў на СССР, і непрыяцелы асалак ад раней шых наскокаў дае аб сабе знаць у перагаворах аб заключэнні гандлёвага дагавору».

***

ЛОНДАН, 30 студзеня (БЕЛТА). Буржуазны друк публікуе падрабязныя паведамленні аг. Рэйтэр аб змесце даклада т. Сталіна на XVII з'ездзе ВКП(б).

За выключэннем «Дэйлі экспрэс», газеты змястоўлі гэтыя паведамленні без каментарыяў. У за галоўках яны вылучаюць указанні т. Сталіна на тое, што пагрозы развіваюцца ў бок новай вайны.

Вялікая ўвага адведзена заявам т. Сталіна аб значэнні совецка-амерыканскіх адносін і адначасова аб нездавальняючым становішчы англа-совецкіх адносін. Але асабліва газеты вылучаюць заяву т. Сталіна аб намеры СССР паўхільна прадаўжаць палітыку міру і побач з гэтым аб узмацненні абароназдольнасці краіны.

«Дэйлі экспрэс» у каментарыях запўляе, што ў СССР ёсць рад стратэгічных пераваг СССР перад Японіяй.

«Дэйлі ўоркер» указвае, што т. Сталін—найвялікшы з вучняў Леніна—паказаў у сваім дакладзе несакрушальнасць СССР, як цытадэлі барацьбы супроць вайны, цытадэлі социялізма, у той час як капіталістычны свет, завязшы ў сваіх няўхільна абвастраючыхся супярэчнасцях і патрасёны ў сваіх асновах, ліхаманкава рыхтуецца да вайны.

ПАЗШ

Н'Ю-ЮРК, 29 студзеня (БЕЛТА). Газета «Балтымор сан», каментуючы даклад Сталіна, лічыць правільнай заяву Сталіна, што вайна прывядзе да новай хвалі рэволюцыі.

— Кожны адказны дзяржаўны дзеяч, — заўважае газета, — ведае гэта. Страх перад народнымі паўстаннямі з'яўляецца магутнейшай перашкодай супроць вайны. Але, указвае далей газета, «ёсць другія фактары, якія могуць змусіць на нішто гэту перашкоду ў часе крызіса, калі часова будуць прабуджаны страсці».

ГЕРМАНІЯ

БЕРЛІН, 30 студзеня. (БЕЛТА). Змест даклада т. Сталіна перадан падрабязна асноўнымі германскімі газетамі. Пераважная частка прэсы, у тым ліку «Фолькішэр беобахтэр» друкуе даклад Сталіна без каментарыяў, пад нейтральнымі загалоўкамі.

Рад газет падкрэслівае вялікае значэнне і адгалосьт Сталіна і указвае на «спакой і стрыманасць, праяўленыя ім у адносінах да Германіі і Японіі.

Вялікі артыкул прысвячае апошнім дакладу Сталіна «Кельнішэ цэйтунг». Падкрэсліваючы дыскусыйнае значэнне даклада Сталіна, газета ўказвае, што ён ставрае базу для далейшага фармулявання адносін СССР да Германіі і Японіі.

«Кельнішэ цэйтунг», спасылаючыся на прамову Гітлера ад 17-га мая 1933 года, сцвярджае, што і «Германія не хоча вайны».

«Франкфуртар цэйтунг» у карэспандэнцыі з Берліна піша:

«Сталін не толькі падкрэсліў, што СССР хоча мірных адносін з Германіяй, але і сказаў, што пазнасць унутрыкапіталістычнага развіцця не можа паўплываць на адносінам абодвух краін».

Газета лічыць, што «своечасова ўспомніць аб апошніх гадах, якія былі гадамі ўцешных гіпакрытных адносін».

У процілегласць гэтым газетам «Рэйнішэ вестфэлішэ цэйтунг», спасылаючыся пры гэтым на адносіны палітычных колаў, піша аб дакладзе Сталіна ў рэзка варожым тоне.

ЯПОНІЯ

ТОКІО, 29 студзеня. (БЕЛТА). Учора ў газеце «Ніці-ніці» з'явілася паведамленне, што міністэрства замежных спраў апублікавала заяву ў форме «інтэрв'ю чыноўніка міністэрства замежных спраў», у якім дае свае каментарыі к дакладу т. Сталіна.

Змест заявы ў выкладанні газеты зводзіцца ў асноўным да наступнага:

«Як звычайна Сталін у сваім дакладзе на з'ездзе ўкамянуў аб Японіі як аб капіталістычнай і імперыялістычнай дзяржаве. Сталін прыводзіць рад момантаў у якасці доказу непрыяцных дзеянняў Японіі ў адносінах да СССР і пагаміцае аб адмаўленні Японіі падпісаць пакт аб ненападзе з Совецкім Саюзам. Аднак, Японія ніколі не адмаўлялася ад заключэння такога пакта, хоць і паведамляла СССР аб тым, што не лічыць, што настоў час для яго заключэння.

Упамінаючы аб незакрытых пытаннях на КУЧ, Сталін, як відаць, на ўказе інцыдэнт у Харбіне, а таксама арышты совецкіх служачых КУЧ. Аднак, гэта пытанне патычыць дзяржаўніцтва КУЧ і звязана з інцыдэнтам, бадзёна лешных результатаў дзейнасці КУЧ. Што-ж датычыць заяў ваенных, дык магчыма, што вядомая частка японскіх ваенных выказвецца за вайну. Аднак, гэта з'яўленне іх асабістай думкай, якая не мае ніякіх адносін да замежнай палітыкі».

Сёння агенцтва Сімбун ранцо і інфармацыйнае бюро «Ніці-ніці» пацвярджае ранейшыя інфармацыі газеты «Ніці-ніці».

*) Радыёстанцыя стратастата.

Менск, друкарня «Звязды».

Адказны рэдактар Г. Н. Брагінскі.

Упаўн. Галоўлітбела № — К 2383.